Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Ц... ...ту БССР.

10 год...

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

№ 256 (2745) Аўторак, 12-га лістапада 1929 г.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. ; 3 „ — 2 р. 70 к. ; 6 „ — 4 р. — к. ; 1 год — 8 р. — к. Змена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок капіталі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок капіталі паперак тэксту 1 р. — к. За радок капіталі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьвяшчы на 50 проц. дарожэй. Знак тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумент — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцам за дакумент — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх паштова-тэлег. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

154 кр. "Савецкая Беларусь" Одесса, Пастера 3, государ-стен. публичн. библиотека. ступ. сьнск. адзін экз.

ДЫРЭКТЫВЫ ПАРТЫІ І ЎРАДУ ПАВІННЫ БЫЦЬ ВЫКАНАНЫ.

...ньня ў нашай газэце зьмяшчаецца пастанова Бюро ЦК КП(б)Б аб стане беларусізацыі савецкага, гаспадарчага і прафсаюзнага апарату. Па пытанню беларусізацыі, як аднаго з галоўных сродкаў ажыцьцяўленьня кіруючай ролі пралетарыяту міліёнымі масамі бядняцка-серадняцкага сялянства, мы мелі за апошнія гады шэраг актыўных пастаноў партыі і Ураду. Сёньняшняю пастановаю Бюро ЦК КП(б)Б падводзяцца вынікі беларусізацыі апарату і даюцца дырэктывы аб узмоцненьні гэтай галіны працы ў ...ым сацыялістычным будаўніцтве.

...справе беларусізацыі за апошні час мы маем велізарнейшыя дасягненьні. Апарат савецкіх, гаспадарчых і прафсаюзных органаў у асноўным апанаваў беларусізацыяй. У культурных установах усіх тыпаў нашае амаль цалкам праводзіцца на беларускай мове. Усё гэта сьведчыць пра тым, што працоўныя масы БССР пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі правільна ажыцьцяўляюць нацыянальную палітыку партыі і савецкай улады.

...шучае правядзеньне Ленінскай лініі нацыянальным пытаньні, нябачны тэмп індустрыялізацыі краіны, значайшы размах сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі вымагаюць жорсткае, упартае супраціўленьне варожых сіл сацыялістычнаму ладу. Кулакі, непманы, і іх агенты нацыянал-дэмакраты, шавіністы розных колераў, усе гэтыя варожыя элементы імкнуцца ўсялякімі мерамі перашкодзіць нашаму пераможнаму наступу на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва. Рабочая клясе і працоўнае сялянства пад ленінскім кіраўніцтвам камуністычнай партыі давалі і будуць даваць заўжды жорсткі адпор варожым сілам і будуць весьці рашучы наступ і ў далейшым на капіталістычныя элементы гораду і вёскі.

Вядучы рашучую барацьбу з варожымі сіламі, партыя і Урад жорстка караюць і будуць караць тых, хто ня хоча выконваць дырэктыў і мерапрыемстваў партыі і Ураду ў той ці іншай галіне нашага будаўніцтва. У пасобных установах назіраюцца выпадкі фармальных адносін да беларусізацыі, ёсьць выпадкі ігнараваньня і нават адкрытых выступленьняў супроць беларусізацыі. Зразумела, такія адносіны да беларусізацыі ня могуць быць цярпімы.

У нашай газэце на-днях паведамлялася аб адносінах да беларусізацыі махровага рэакцыянэра прафэсара Шчапоцьева. Мы ведаем, што сярод невялікай часткі студэнцтва БДУ ёсьць імкненьні ігнараваць беларусізацыю. Мы ведаем, што ў Гомельшчыне з беларусізацыяй справа вельмі дрэнна абстаіць. Прафсаюзны апарат таксама ня можа пахваліцца беларусізацыяй, як ня могуць пахваліцца некаторыя гаспадарчыя і савецкія органы. Усё гэта кажа аб тым, што тэмп беларусізацыі павінен быць узмацнёны, што пасыўныя адносіны павінны быць вломлены, што з варожымі элементамі, якія перашкаджаюць ажыцьцяўленьню беларусізацыі, неабходна весьці рашучую барацьбу.

Бюро ЦК КП(б)Б сваёю пастановаю абавязвае камуністаў, якія стаць на чале тых ці іншых устаноў, у якіх яшчэ праца па беларусізацыі цалкам не праведзена, у бліжэйшы тэрмін скончыць поўны перавод працы апаратаў гэтых устаноў на беларускую мову. Разам з гэтым даецца дырэктыва адпаведным органам сыстэматычна праводзіць праверку выкананьня пастаноў партыі і ўраду па беларусізацыі апарату.

Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на поўную беларусізацыю навучальных устаноў, якія рыхтуюць маладыя кадры спэцыялістаў для гаспадарчага і культурнага будаўніцтва БССР. У адносінах да тых, хто будзе ўхіляцца ад беларусізацыі, належыць ужываць самыя рашучыя меры ўзьдзейнічаньня аж да выключэньня з навучальнай установы.

Дырэктывы партыі і ўраду ў справе беларусізацыі павінны безадкладна выконвацца ўсімі адміністрацыйнымі, гаспадарчымі, прафсаюзнымі і культасьветнымі установамі.

Прывітаньне ЦК УсеКП(б).

МАСКВА, 11-XI. ЦК УсеКП(б) атрымаў наступную тэлеграму з Лёндану: „КАМУНІСТЫЧНАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ ДА 12-х УГОДАК. З РАДАСЬЦЮ ВІТАЕМ ВЯЛІКАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПЯЦІГАДОВАГА ПЛЯНУ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТЫІ. НЯХАЙ ЖЫВЕ УсеКП(б)! НЯХАЙ ЖЫВЕ КАМУНІСТЫЧНЫ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ!

Сэкратарыят Брытанскай кампартыі".

* * *

Таксама атрымана тэлеграма з Лейпцыгу, у якой рабочыя і работніцы, сабраўшыся на сьвяткаваньне 7-га лістапада, насылаюць братэрскае прывітаньне генэральнаму штабу кампартыі і пралетарыяту Савецкага Саюзу.

„Клянемся аддаць усе сілы за бацькаўшчыну ўсіх працоўных і стварыць у самой Нямеччыне пралетарскую дзяржаву.

Няхай жыве савецкі Саюз.

Няхай жыве Камуністычны Інтэрнацыянал!»

Калектывізацыяй адзначылі XII гадавіну.

ЦВК і СНК БССР.

Калгасьнікі 12 сельсаветаў Рагачоўскага і Жлобінскага раёнаў якія сабраліся на агульную канфэрэнцыю ў дзень сьвята 12 гадавіны Кастрычніка пастанавілі арганізаваць адзін волаткалгас плошчаю ў 80.000 гэктараў, не данусьцёўшы піводнага хутара і пасёлка. Канфэрэнцыя запэўніла, што прыме ўсе захады для правядзеньня ў жыцьцё дырэктыў партыі і савецкай улады ў рэканструкцыі народнай гаспадаркі.

Няхай жыве савецкая ўлада і камуністычная партыя Беларусі.

Нахай жывуць працоўныя масы Савецкай Беларусі,

Канфэрэнцыя.

Рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь"

У адзнаку XII гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі ў Брацькаўскім сельсавеце, Касьцюковіцкага раёну, Магілеўскай акругі арганізована калгас на плошчы каля 2500 га, якому дадзена назва „імя XII-годзьдзя Кастрычнікавай Рэвалюцыі". У Нікаўскім сельсавеце камуна «Савецкая Беларусь» узбуйнена за лік насельніцтва вакольных вёсак да 4000 га.

ПРЭЗЫДЫУМ КАСЬЦЮКОВІЦКАГА РВК. БЮРО РК КП(б)Б

* * *

Агульны сход камунараў Бухара-Пралетарскай камуны № 2 Касьцюковіцкага раёну (Магілеўшчыны), у сувязі з узбуйненьнем гэтакай, прыняў пастанову аб дачы камуне назвы „Савецкая Беларусь".

Зараз камуна складаецца з 120 сямействаў. Зямлі налічваецца каля 4000 га.

Вакол камуны арганізаваны тры калектывы, у чым камунары прымалі актыўны удзел.

У мэтах паляпшэньня кіраўніцтва і культурнага становішча камунараў, здавальненьня газэтамі і літаратурай, агульны сход камунараў прасіць „Савецкую Беларусь" прыняць шэфства над камунай, выслаўшы свайго прадстаўніка для афармленьня гэтакага.

Камунары: Малыга, Лосеў, Дударэвіч, Мядзьводзкі і Бабаноў.

АД РЭДАКЦЫІ: Вітаем вашу пастанову аб узяцьці шэфства над камунай „Савецкая Беларусь". Пры першай магчымасьці, вышлем да вас свайго прадстаўніка для афармленьня шэфства.

Аўстралія—за аднаўленьня зносін з СССР.

ЛЁНДАН, 8-XI. Рэйтэр паведамляе, што аўстралійскі ўрад у асобе прэм'ера заявіў аб тым, што Аўстралія адобрыла адноўленьне дыпляматычных зносін з СССР на аснове ўзаемных абавязацельстваў 1924 году.

Прывітаньні,

атрыманыя рэдакцыяй газэты „Савецкая Беларусь" з Ленінграду за дню XII гадавіны Кастрычніка.

ЦВК БССР і газ. „Савецкая Беларусь".

Ленінградзкі Савет вітае з 12-ай гадавінай вялікай Кастрычніковай Рэвалюцыі Савецкую Беларусь.

У гэтыя гістарычныя дні рабочыя гораду Ленінграду ня могуць не адзначыць тую братэрскую салідарнасьць беларускіх працоўных, якая была выказана адпраўкай чырвоных эшалёнаў на наш адрас.

Ленінградзкі Савет шчыра вітае беларускіх рабочых і сялян са сьвятам XII-ці-годзьдзя Кастрычніка.

Няхай жыве вялікі XII Кастрычнік.

Нахай жывуць беларускія працоўныя.

СТАРШЫНЯ ЛЕНІНГРАДЗКАГА САВЕТУ КАМАРОЎ.

* * *

У дні сьвяткаваньня XII-ай гадавіны Кастрычніка газэта ленінградзкіх рабочых «Ленінградская Праўда» лічыць сваім абавязкам паведаміць аб тае хвалі прывітаньняў, якой было спатканa на фабрыках і заводах прыбыцьце чырвоных эшалёнаў з Беларусі.

Ленінградзкія рабочыя ўбачылі ў гэтым факце доказ посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва ў Беларусі, посьпех калгаснага руху, удзел працоўных Беларусі ў індустрыялізацыі краіны.

Няхай жыве Савецкая Беларусь.

Нахай жыве сацыялістычнае наступленьне.

Няхай жыве пралетарская рэвалюцыя ва ўсім сьвеце.

„ЛЕНІНГРАДЗКАЯ ПРАЎДА"



(ЧЛЕН РЭВВАЕНСАВЕТУ СССР. ТУХАЧЭЎСКІ).

* * *

XII-ую гадавіну Кастрычніка ўсе Савецкія Рэспублікі сустракаюць разгорнутай вялікай сацыялістычнай рэканструкцыяй. Шчырае прывітаньне будаўнікам сацыялізму—рабочым і сялянам Савецкай Беларусі.

Сэкратар Усе ЦСПС Г. ВАЙНБЭРГ.

* * *

Чырвонафлётцы і камандна-палітычны склад Чырвонаштандартнага Балтыцкага флёту вітае рабочых і сялян Савецкай Беларусі з XII гадавінай Кастрычніка.

У дні Кастрычнікавай гадавіны Чырвоная армія і флёт рапартуюць працоўным БССР, што яны пільна стаяць на межах нашага вялікага Саюзу і заўсёды гатовы выканаць свой доўг абароны завае Кастрычніка.

Нахай жыве сусьветны Кастрычнік.

Нахай жыве Савецкая Беларусь.

ЧЛЕН РВС БАЛТФЛЁТУ Г. КІРЗЕУ

* * *

Прыбыцьцё чырвоных эшалёнаў Беларусі ў Ленінград напярэдадні 12-ай гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі—лепшы доказ братэрскай сувязі паміж савецкімі рэспублікамі, якія нарадзіліся пралетарскім паўстаньнем 1917 году.

Рэдакцыя „Красной Газеты" вітае рабочых і сялян Савецкай Беларусі, якія будуюць сацыялістычную дзяржаву.

Нахай жыве XII Кастрычнік.

Нахай жывуць рабочыя і сяляне БССР

Рэдактар „Красной Газеты" БАЎЭР

Пастанова Бюро ЦК КП(б)Б

аб стане беларусізацыі савецкага, гаспадарчага і прафэсыянальнага апарату.

...ЦК КП(б)Б праз увесь час рашуча праводзіць ленінскую лінію ў нацыянальным пытаньні. БССР з краіны адсталай і культурна заняпалай, нацыянальна-прыгнечанай за часы царызму, краіны разбуранай вайной і нацыянальнымі, ператварылася над кіраўніцтвам КП(б)Б і з вялізарнай дапамогай СССР, у краіну, дзе нявіданым дагэтуль расьце прамысловасьць, расьце зьвяваецца сельская гаспадарка са сталым павялічэньнем яе сацыялістычнага сэктару, паляпшаецца матэрыяльны і культурны ўзровень рабочых і сялянскіх мас, пашыраецца пралетарская база, узмацняецца саюз рабочага класы з асноўнымі масамі сялянства. На глебе магутнага росту эканомікі краіны мы маем буйны росквіт пролетарскай культуры беларускіх працоўных мас і культуры нацыянальных меншасьцяй. Шырокія масы рабочых і працоўнага сялянства ўцягнуты ў справу сацыялістычнай рэканструкцыі краіны, у справу эканамічнага і культурнага будаўніцтва.

Наш эканамічны і культурны рост і сьпяховае наступленьне на капіталістычныя элементы гораду і вёскі ствараюць абвостранае клясавай барацьбы на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва.

Поруч з актыўным супраціўленьнем кулацтва і непмана ў горадзе і на вёсцы, дзе актывізацыя варожых нам сілаў і, што вызначылася ў актывізацыі росьце беларускага нацыянал-дэмакратызму, у росьце шавінізму расізму, яўрэйскага і інш.

У ўмовах абвостранай клясавай барацьбы беларусізацыя зьяўляецца адзін з асноўных сродкаў па ажыцьцяўленьні кіруючай ролі пралетарыяту ў асноўных мас сялянства, была і застаецца нашай магутнай зброяй у змаганні з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, расейскім і іншымі шавінізмамі.

У галіне беларусізацыі мы маем вялікія посьпехі і гэта зьмушае нас таго, што пралетарыят шчыльней падышоў да аўладаньня культурнымі каштоўнасьцямі, што ён моцна ...овіцца на чале культурнага будаўніцтва. Посьпехі беларусізацыі ...больш узмацняюць саюз пралетарыяту з асноўнымі масамі сялянства, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі.

...той-жа час на паасобных участках, у паасобных апаратах савецкіх, прафсаюзных і гаспадарчых установах мы маем неразумнае палітычнае значэньня беларусізацыі і адставаньне ў правядзеньні беларусізацыі з боку партыйных камітэтаў. ...ецца яшчэ недастаткова праца нагляду і кантролю за выкананьнем дырэктыў партыі па правядзеньні беларусізацыі. Назіраюцца шэраг недахопаў фармальных адносін да беларусізацыі, насыўнае супраціўленьне ...ват паасобных выпадкі адкрытых выступленьняў супроць беларусізацыі. Больш слабым участкам у справе беларусізацыі зьяўляюцца некаторыя прэсьлянальныя, гаспадарчыя і гандлёва-каапэрацыйныя ўстановы, як-раз ...ўстановы, работнікі якіх зьвязаны і маюць дачыненьне да шырокіх працоўнага сялянства.

...навучальных установах беларусізацыя значна пасунулася ўперад, але ...м з гэтым яшчэ назіраецца, што ...руская мова не заўсёды ўжываецца ...ў быту студэнцтва, назіраюцца ...альныя адносіны да беларусізацыі з боку некаторай часткі студэнтаў і ...ных працаўнікоў.

Найбольш слаба беларусізавана студэнцтва і навуковыя працаўнікі Мэдфаку БДУ, факультэту права і гаспадаркі і асабліва Віцебскага Ветэрынарнага Інстытуту.

На прафсаюзах, пры наяўнасьці палепшаньня беларусізацыі масавай работы, асабліва на прадпрыемствах, большага пераводу работы нізавога прафапарату на беларускую мову, наглядаецца адначасна, што з боку фракцыі ЦСПСБ ня зроблена рашучага пералому ў справе беларусізацыі апаратаў цэнтральных і некаторых акруговых прафорганаў, нездавальняюча выконваюцца пастановы зьезду КП(б)Б аб пераводзе культмасавай работы на беларускую мову, ня былі ўжыты рашучыя захады шляхам мабілізацыі пралетарскай грамадзкасьці супроць таварышоў, якія ня выконваюць тэрмінаў беларусізацыі, у выніку чаго маюцца выпадкі пераходу з беларускае мовы на расейскую (саюз транспартнікаў), вядзеньне ўсяе работы на расейскай мове (саюз гарбароў), практычная работа ЦСПСБ, ЦП саюзу і АСПС напалову вядзецца на расейскай мове і ў апаратах маецца яшчэ значная колькасьць работнікаў, якія ня ведаюць беларускае мовы.

Адначасова пры наяўнасьці пасьпяховага правядзеньня беларусізацыі ў савецкіх установах, трэба адзначыць фармальныя адносіны і адставаньне ў тэмпах беларусізацыі ў радзе савецкіх устаноў, як напрыклад ЦСК, ВСНГ, Дзяржплян, НК Аховы Здароўя, Наркамгандаль, Наркамфін, Дзяржбанк.

Выходзячы з адзначанага, Бюро ЦК КП(б)Б **пастанаўляе:**

1. Партыйным камітэтам і органам ЦКК РСІ **узмацніць увагу да пытаньняў беларусізацыі** ў мэтах найхутчэйшага ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі аб беларусізацыі, дзяржаўных, праф. і інш. устаноў, праводзячы сыстэматычную праверку выкананьня дырэктыў па беларусізацыі.

2. Батэгарычна прапанаваць партарганізацыям усіх дзяржаўных, гаспадарчых, гандлёва-каапэрацыйных і навучальных устаноў, дзе праца па беларусізацыі яшчэ ня цалкам праведзена, пад пэрсанальную адказнасьць камуністых, якія стаяць на чале гэтых устаноў і арганізацый, **у бліжэйшы тэрмін скончыць поўны перавод працы апаратаў гэтых устаноў на беларускую мову.** Нацкамісіі прасачыць за выкананьнем гэтай пастановы.

3. З асобай рашучасьцю паставіць перад фракцыяй ЦСПСБ, ЦП саюзаў і АСПС задачу **ўзмацненьня і заканчэньня беларусізацыі сваіх апаратаў, разгортваньня і ўзмацненьня работы прафарганізацый у галіне беларусізацыі сваёй масавай работы,** каб яшчэ больш замацаваць пад кіраўніцтвам КП(б)Б кіруючую ролю пралетарыяту ў адносінах да асноўных мас сялянства.

4. У мэтах падрыхтоўкі маладых кадраў спэцыялістых для БССР, Наркамасьветы **рашуча праводзіць беларусізацыю навучальных устаноў, шляхам устанаўленьня абавязковага веданьня беларускае мовы ўсімі паступаючымі ў ВНУ і праверкі гэтых ведаў; прыняць рашучыя меры да выкладаньня ўсіх дысцыплін у навучальных установах на беларускай мове; устанавіць абавязковасьць здачы і прыёму залікаў, сэмінарскіх работ, дыплёмных і ўсякіх іншых прац ад студэнтаў на беларускай мове: адносна тых студэнтаў, якія ў працэсе вучобы ўхілялі...**

Рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь"

У адзнаку XII гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі ў Брацькаўскім сельсавеце, Касьцюковіцкага раёну, Магілеўскай акругі арганізована калгас на плошчы каля 2500 га, якому дадзена назва „імя XII-годзьдзя Кастрычнікавай Рэвалюцыі". У Нікаўскім сельсавеце камуна «Савецкая Беларусь» узбуйнена за лік насельніцтва вакольных вёсак да 4000 га.

ПРЭЗЫДЫУМ КАСЬЦЮКОВІЦКАГА РВК. БЮРО РК КП(б)Б

* * *

Агульны сход камунараў Бухара-Пралетарскай камуны № 2 Касьцюковіцкага раёну (Магілеўшчыны), у сувязі з узбуйненьнем гэтакай, прыняў пастанову аб дачы камуне назвы „Савецкая Беларусь".

Зараз камуна складаецца з 120 сямействаў. Зямлі налічваецца каля 4000 га.

Вакол камуны арганізаваны тры калектывы, у чым камунары прымалі актыўны удзел.

У мэтах паляпшэньня кіраўніцтва і культурнага становішча камунараў, здавальненьня газэтамі і літаратурай, агульны сход камунараў прасіць „Савецкую Беларусь" прыняць шэфства над камунай, выслаўшы свайго прадстаўніка для афармленьня гэтакага.

Камунары: Малыга, Лосеў, Дударэвіч, Мядзьводзкі і Бабаноў.

АД РЭДАКЦЫІ: Вітаем вашу пастанову аб узяцьці шэфства над камунай „Савецкая Беларусь". Пры першай магчымасьці, вышлем да вас свайго прадстаўніка для афармленьня шэфства.

У XII ГАДАВІНУ КАСТРЫЧНІКА ЗА МЯЖОЙ

Ні паліцэйскі тэрор, ні масавыя арышты, ні збойствы ня стрымалі магутных дэманстрацый пралетарыяту капіталістычных краін у абарону Савецкага Саюзу.

Дэманстрацыя пралетарыяту Польшчы.

ВАРШАВА, 9-XI. Учора у розных мясцох гораду з раніцы і да позьняга вечара адбываліся рабочыя дэманстрацыі ў чэсьць Кастрычнікавых угодак. Не зважаючы на тое, што ўсе пункты, дзе магла быць наладжана дэманстрацыя, былі заняты паліцыяй, дэманстрацыі адбыліся ля астрогу Павяк, на Мар'яніскай, Хлоднай, Жалезнай, Гарнаслаўскай і Чарнякоўскай вуліцах. У цэнтры гораду, на пляцу маршала Пілсудзкага, была зроблена спроба наладзіць мітынг. Аднак, кожны раз паліцыя ўмешвалася і разганяла дэманстрантаў.

На некаторых фабрыках здарыліся сутычкі між прыхільнікамі і ворагамі сьвяткаваньня Кастрычніка.

Напярэдадні ў Варшаве былі ўчынены масавыя аблавы і арышты. У дзень угодак Кастрычніка раздадзена вялікая колькасьць спэцыяльнай кастрычнікавай літаратуры.

Атрыманы першыя весткі аб дэманстрацыях у правінцыі. Дэманстрацыі адбываліся ў Лодзі, Вільні, Львове, Катавіцах і Дамброўскім басэйне. У Лодзі выступаў камуністычны дэпутат Росляк. У Вільні палітычныя зьняволеныя наладзілі дэманстрацыю ў часе прагулкі.

У Лодзі, не зважаючы на мабілізацыю ўсіх сіл, камуністычнаму дэпутату Росляку ўсё-ж такі ўдалося наладзіць мітынг перад фабрыкаю Гэйера. Адбіваючыся ад паліцыі ўдзельнікі мітынгу наладзілі працэсію, і па чале з Росякам прайшлі па гораду да Паб'яніцкай шасы. Дэманстранты сьпявалі рэвалюцыйныя сьпевы і выкрыкалі лёзунгі ў чэсьць СССР, 12-х угодак Кастрычніка і супроць падрыхтоўкі вайны. Паліцыя пяць разоў атакавала працэсію. Шмат забітых і параненых.

ПРЫЁМ У ПРАДСТАЎНІЦТВЕ.

АНГОРА, 9-XI. На Кастрычніковым прыёме ў наўнамоцным прадстаўніцтве прысутнічаў прэм'ер, міністры, старшыня парляманту, каля 100 дэпутатаў, дыпляматычны корпус, шмат грамадзкіх і палітычных дзеячоў, вышэйшыя асобы з міністэрстваў і журналісты, а ўсяго больш за 300 чалавек. Кемаль-паша прыслаў прывітаньне з угодкамі Кастрычніка.

У Кітаі будзе свой Кастрычнік.

ХАБАРАЎСК, 10-XI. У дзень 12-х угодак Кастрычніка на ўсяму Далькраю адбыліся выключна шматлюдныя дэманстрацыі, карнавалы і сьвяткаваньні. Цэнтрам увагі была асобая Дальармія, часьці якой прыязлі ўдзел у дэманстрацыях, вечарох сувязі і мітынгах.

У часьці арміі, якія знаходзяцца на мяжы, накіроўваліся шматлікія дэманстрацыі працоўных краю і з усіх канцоў Савецкага Саюзу. Дэлегацыі прывозілі падарункі.

Выступаўшы на мітынгу ў Хабараўску ваенна-палонны кітайскі салдат заявіў: «Толькі тут, у краіне саветаў, я даведаўся шчырай праўды аб нявольніцтве і прыгнечаньнях, якія церпяць шматмільённыя масы Кітаю, эксплёатуемыя мандарынамі, абшарнікамі і капіталістамі. Толькі тут я даведаўся, як надманваюць рабочых і сялян Кітаю генэралы. Толькі СССР — сапраўдная бацькаўшчына тых, хто працуе. У Кітаі павінен быць і будзе свой Кастрычнік".

ДЭМАНСТРАЦЫЯ РАБОЧЫХ НЯМЕЧЧЫНЫ.

БЭРЛІН, 9-XI. Як паведамляюць з Бэрну, у шмат якіх гарадох Нямеччыны адбылося сьвяткаваньне 12-х угодак Кастрычнікавай рэвалюцыі. У Бадэне на масавым сходзе, прысьвечаным угодкам Кастрычніка, удзельнічала больш за 5 тысяч чалавек.

У Нямеччыне дзень Кастрычнікавай рэвалюцыі быў адзначаны вулічнымі дэманстрацыямі і мітынгамі ў зачыненых памяшканьнях. Выступаўшыя прамоўцы процістаўлялі імпэрыялістычны плян Юнга савецкай пяцігодцы і растлумачвалі значэньне пяцігодкі для міжнароднага рэвалюцыйнага руху.

У Дусэльдорфе атрады паліцыі напалі на дэманстрантаў і цяжка парапілі шмат рабочых.

У Любэку на сходзе, у якім брала ўдзел 5 тысяч чалавек, выступіў Тэльман з прамоваю, прысьвечаную Кастрычнікавай рэвалюцыі.

ДЭМАНСТРАЦЫЯ ШВЭДЗКІХ РАБОЧЫХ.

СТАКГОЛЬМ, 9-XI. У сувязі з угодкамі Кастрычніка адбылася ў Стакгольме масавая дэманстрацыя, якая зьявілася першай кастрычнікавай дэманстрацыяй камуністычнага руху Швэдыі (у мінулым угодкі Кастрычніка адзначаліся толькі зачыненымі сходамі).

Кастрычнікавая дэманстрацыя сёлета была наладжана, не зважаючы на забарону паліцыі. У выніку наскову паліцыі зьбіта некалькі рабочых, у тым ліку і жанчыны.

У чэсьць СССР.

МЭКСЫКА, 10-XI. У наўнамоцным прадстаўніцтве адбыўся прыём у адзнаку 12-х угодак Кастрычнікавай рэвалюцыі. На памяшканьнях місій і консульстваў 12-ці эўрапейскіх і іншых дзяржаў былі ўзьняты нацыянальныя сьцягі ў чэсьць СССР.

АСАДНАЕ СТАНОВІШЧА Ў РУМЫНІІ

ВЕНА, 9-XI. Водлуг дадатковых паведамленьняў з Бухарэсту, у дзень угодак Кастрычніка па ўсёй Румыніі распаўсюджваліся камуністычныя адозвы, якія заклікалі масы да забастоўкі і дэманстрацый супроць фашызму на абарону Савецкага Саюзу. Асабліва падкрэсьлівалася ў гэтых адозвах значэньне савецкай пяцігодкі для міжнароднага рабочага руху.

У дзень 7 лістапада ўсе гарады Румыніі абярнуліся ў вайсковыя лягеры. Адміністрацыйныя ўстановы, банкі, чыгункі, паштовыя канторы, тэлефонныя станцыі, мытніцы, буйныя фабрыкі і г. д. вартаваліся салдатамі ў поўнай баявой падрыхтаванасьці. У шмат якіх гарадох напярэдадні 7 лістапада ўчыняліся масавыя вобыскі і арышты ўдзельнікаў сходу на прадпрыёмствах. Буржуазны лжэдрук, які звычайна замоўчвае рэвалюцыйныя падзеі, прымушан быў прызнаць рэвалюцыйныя настроі мас.

ФРАНЦУСКІ ПРАЛЕТАРЫЯТ СПЫНІЎ ПРАЦУ.

ПАРЫЖ, 9-XI. Кастрычнікавая гадавіна ў Францыі адсьвяткавана ў адрозьненьне ад мінулых гадоў ня толькі масавымі мітынгамі ў сярэдніх прамысловых цэнтрах, але і выступленьнямі на прадпрыёмствах, а таксама спыненьнем працы (у Бордо, Ліёне і інш.). Паліцыя мабілізавала значныя паліцэйскія сілы, учыняла вобыскі ва ўнітарных саюзах і ў памяшканьнях кампартыі.

Кастрычнікавыя выступленьні прайшлі ўсюды ў абставінах павышанай баяздольнасьці мас і далі штурмок напулярызацыі тэмпаў савецкай пяцігодкі,

Танкавыя атрады супроць дэманстрантаў

ВАРШАВА, 6-11. Дэкрэт прэзыдэнта аб адтэрмінаваньні бюджэтнай сэсіі сойму на 30 дзён выклікаў рэвалюцыю пратэсту ўсіх апазіцыйных груп.

Орган ППС „Роботнік" зьмяшчае сёньня тэкст прапановы, падпісанай апазіцыяй, аб выказе недавер'я ўраду.

„Роботнік" паведамляе, што ў сувязі з падзеямі ў сойме ППС склікала некалькі мітынгаў пратэсту ў Лодзі, Кракаве, Львове і іншых мясцох. Водлуг слоў газэты, у некаторых гарадох пасьля мітынгаў адбываліся дэманстрацыі. Асабліва шырокія размеры набыла дэманстрацыя ў Львове, дзе для разгону дэманстрантаў было выклікана войска, у прыватнасьці танкавыя атрады. Паліцыя ўсюды нішчадна выступала супроць дэманстрантаў, разганяючы ўдзельнікаў яе.

На думку некалькіх газэт, мітынгі былі скліканы ППС, аднак, камуністы захапалі ў свае рукі ініцыятыву і павялі работнікаў на дэманстрацыі.

У КІТАІ.

Посьпехі войска Чан-Фа-Гуя.

ШАНХАЙ, 7-XI. Рэйтэр паведамляе, што ўсл тэрыторыя між гуансійска-хунаньскай мяжой і Пінлё (у Гуансійскай правінцыі за 240 кілёмэтраў ад Хунаньскай правінцыі) занята войскам Чан-Фа-Гуя.

Масавае дэзэртырства ў кітайскім войску.

ТОКІЁ, 10-XI. Водлуг паведамленьня з Харбіну, дэзэртырствы і масавыя рабункі пры адступленьні кітайскіх часьцей у апошніх сутычках над Лахасуху і Фугдынам прымусілі Чжан-Сюэ-Ляна зьвярнуць увагу камандаваньня на «нядбайства камандзнага складу». Вінаватых у адступленьні Чжан-Сюэ-Ляи аддае ваеннаму суду.

Арыштавана 300 чалавек за 3 дні.

ТОКІЁ 10-XI. Водлуг паведамленьня з Харбіну ад 8 лістапада, ізноў на гэты дзень, згодна паліцэйскага паведамленьня, арыштавана 53 грамадзяніны СССР. За апошніх тры дні лік арыштаваных савецкіх грамадзян перасягнуў 300 чалавек.

25 тысяч рабочых віталі „Страну Советов"

НЬЮ-ЁРК, 10-XI. Над адкрытымі небам на артылерыйскім стадыёне адбыўся вялікі мітынг у чэсьць прылёту „Страны Советов". На мітынгу прысутнічала больш за 25 тысяч рабочых. Прадстаўнікі шэрагу рабочых арганізацый у сваіх прывітаньнях заяўлялі аб салідарнасьці з рабочымі і сялянамі Савецкага Саюзу.

„Таварыства прыяцеляў Савецкага Саюзу" абвясьціла, што за грошы, сабраныя на падарунак „Стране Советов", будзе набыта 20 трактараў. Пасьля мітынгу з вялікім уздымам адбыўся парад пралетарскіх піанэраў і рабочых спартыўных арганізацый.

Рэзалюцыя пленуму ЦКК КП(б)Б па дакладу т. КАЛНІНА

аб рашэньнях прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) па рабоце ЦКК НКРСІ Беларусі.

1. Заслухаўшы даклад т. Калніна аб рашэньнях Прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) па абсьледваньні органаў ЦКК-РСІ Беларусі і даклад аб рабоце Прэзыдыуму ЦКК, Пленум цалкам і поўнасьцю далучаецца да рашэньняў ЦКК УсеКП(б) і ацэнцы работы ЦКК НКРСІ Беларусі.

Дзейнасьць Прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б пасьля рашэньняў Прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) выяўленьнем правага ўхілу на практыцы, шэрагу ненармальнасьцяй у рабоце савецкага і гаспадарчага апарату, зажыму самакрытыкі з яшчэ большай вастратой падцьвердзіла правільнасьць адзначаных Прэзыдыумам ЦКК УсеКП(б) недахопаў у працы ЦКК і АКК КП(б)Бел.

Пленум ЦКК КП(б)Б з асобай сілай і рашучасьцю завастрае ўвагу органаў ЦКК РСІ на зьнішчэньне выяўленых абсьледваньнем недахопаў, і выходзячы з асобных задач органаў КК РСІ ў барацьбе з парушэньнямі дырэктыў партыі, апартуністычнымі скажэньнямі і ў садзейнічаньні партыі па мабілізацыі на барацьбу з імі ўсяе партыі і рабочае клясы,—Пленум ЦКК КП(б)Б лічыць, што праверка работы і рэзкая крытыка недахопаў у працы КК РСІ у рашэньнях ЦКК УсеКП(б) аказвае істотную дапамогу органам ЦКК у зжыцьці маючыхся недахопаў і ў перамаганьні цяжкасьцяй у працы і бюракратычнага супраціўленьня мерапрыемствам ЦКК КП(б)Б, тым самым паказываючы рашучае ажыцьцяўленьне ў органах КК РСІ самакрытыкі, як мэтаду кіраўніцтва нашае партыі і барацьбы з недахопамі.

2. Прызнаючы дзейнасьць Прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б у агульным і цэлым здавальняючай і накіраванай на правядзеньне рашэньняў XVI-й канфэрэнцыі УсеКП(б) і XII зьезду КП(б)Б, на ўзмацненьне шэрагаў КП(б)Б, зьдзейсьненьню лёзунгу самакрытыкі, па барацьбе з права-апартуністычным ухілам і з скажэньнямі клясавай лініі партыі ў шэрагу органаў (НКЗ, НКФ, Белсаматужпрамкаапэрацыя, суд. органы і інш.), а таксама па ачышчэньні партыі ад разлажыўшыхся і правых ухілістых, якія праводзілі ў штодзённай сваёй працы апартуністычную лінію, і адзначаючы правядзеньне Прэзыдыумам ЦКК шэрагу мерапрыемстваў па ўпарадкаваньні паасобных галін савецкай і гаспадарскай работы, Пленум ЦКК у той-жа час з усёй бальшавіцкай праматой прызнае, што ЦКК і ў асаблівасьці паасобныя АКК, у радзе выпадкаў наказаныя хваравітыя зьявішчы ўскрывалі несваячасова і недастаткова рашуча вялі барацьбу за ажыцьцяўленьне сваіх мерапрыемстваў па іх зжыцьці. Пленум ЦКК прапануе АКК сыстэматычна і своечасова інфармаваць Прэзыдыум ЦКК аб маючыхся хваравітых зьявішчах і своечасова прымаць меры па барацьбе з імі.

Ухваляючы ўпаўне правільныя і рашучыя мерапрыемствы Прэзыдыуму ЦКК, накіраваныя па рашучае ўзмацненьне барацьбы з правым ухілам і яго праявамі ў практычнай рабоце,—Пленум ЦКК прапануе Прэзыдыуму ЦКК і АКК у далейшым яшчэ больш рашуча весьці барацьбу з апартуністычнымі скажэньнямі на падставе рашучага разгортваньня самакрытыкі, своечасова выяўляючы недахопы ў рабоце партыйных, савецкіх і праф. арганізацый, шляхам мабілізацыі ўвагі партыйных і беспартыйных мас на барацьбу з імі і вядучы рашучую барацьбу з прымірэнцтвам і спробамі замазваньня.

3. Несваечасовае выяўленьне шэрагу вапіючых скажэньняў, якія доўгі час заставаліся захаванымі ад партыі, паказвае, што самакрытыка ў арганізацыях КП(б)Б разгорнута яшчэ недастаткова, цэлы шэраг партыйных, савецкіх і прафэс. органаў у адносінах да барацьбы з агідна сьцямі і парушэньнямі дырэктыў партыі праяўлялі бязьдзейнасьць ці пакрывацельства, а паасобныя акруговыя і райённыя парторганы дапускалі слабасьць у барацьбе з разлажэньнем, зажымам самакрытыкі і бюракратычнай няўважлівасьцю да прапаноў рабочых і карэспандэнцыям рабселькораў. Гэткае становішча, калі шэраг недапусьцімых скажэньняў і парушэньняў самакрытыкі выкрываліся ЦКК КП(б)Б пры процідзейнічаньні мясцовых парторганаў (Мазыр, Орша ў 1928 г.), і тое, што ў апошні час прэзыдыумам ЦКК выкрыты недапусьцімыя парушэньні самакрытыкі (Віцебская справа газ. «Заря Запада», ячэйка мэбляўшчыкаў —Менск, справа інвалідзкай каапэрацыі і інш.),—падкрэсьлівае з усёй рэзкасьцю, што АКК РСІ не паставілі належным чынам сваю работу па разгортваньні самакрытыкі і не скарыстоўваюць сваіх правоў у адносінах інфармацыі аб скажэньнях і апратэставаньні няправільных рашэньняў у ЦКК. Пленум ЦКК прапануе ўсім АКК рашуча палепшыць сваю работу па сувязі з масамі і жорсткай расправе з парушыцелямі самакрытыкі. Прэзыдыуму ЦКК і АКК з усёй рэзкасьцю выпраўляць і перасякаць скажэньні самакрытыкі, арганізуючы сыстэматычную праверку ажыцьцяўленьня мерапрыемстваў, якія паказаны ў чэрвенскім зваротку ЦК аб самакрытыцы і ў рашэньнях XVI-й партканфэрэнцыі УсеКП(б).

4. Ня гледзячы на тое, што за апошні перыяд работы ЦКК і АКК значна палепшылася ўцягваньне мас у работу РСІ, Пленум ЦКК прызнае вынікі ўдзелу мас усё яшчэ недастатковымі, з прычыны недастатковай работы па іх арганізацыі.

Пленум ЦКК лічыць важнейшай задачай ЦКК і АКК на бліжэйшы перыяд, побач з далейшым узмацненьнем прыцягненьня мас, дабіцца лепшай арганізацыйнай настаноўкі гэтай работы, сыстэматычнай падгатоўкі вылучэнцаў з актыўна прымаючых удзел у рабоце РСІ, прыступіць да арганізацыі часовых рабочых кантрольных камісій, ажывіць і разгарнуць работу сэкцый РСІ саветаў і рэвкамісій; аб выніках гэтай работы і далейшых мерапрыемствах даручыць Прэзыдыуму ЦКК унесьці пытаньне на чарговым пленуме ЦКК.

5. У галіне рацыяналізацыі савецкага апарату, ня гледзячы на праведзеную работу ЦКК-РСІ, вынікі гэтай работы да гэтага часу зьяўляюцца нездавальняючымі, з прычыны супраціўленьня савецкага апарату і недастатковай увагі рацыяналізатарскім мерапрыемствам кіраўнікоў установаў. Тая акалічнасьць, што ў рашэньнях Прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) з асобай рэзкасьцю адзначаецца шэраг фактаў грубага невыкананьня рашэньняў ЦКК-РСІ і нават простага супраціўленьня асобных органаў (ВСНГ па лініі рацыяналізацыі прамысловасьці, саматужпрамкаапэрацыі і мясцовай прамысловасьці і г. д.)—Пленум прызнае гэту недастатковую рашучасьць у перамаганьні супраціўленьня бюракратычных элемэнтаў апарату буйнейшым недахопам у працы органаў ЦКК-РСІ. Пленум ЦКК паказвае на неабходнасьць сьмелага і рашучага пераводу дзяржапарату на сыстэму адказных выканаўцаў, рашучага зьнішчэньня паралелізму, ажыцьцяўленьня закону аб узмацненьні правоў нізавога сав. апарату, перагляду тэхнікі кіраўніцтва ў бок спрашчэньня яе і правядзеньня большай самарацыяналізатарскай работы дзяржустаноў. Асобная ўвага пры гэтым павінна быць зьвернута на правільнасьць пастаноўкі праверкі выкананьня і бязьлітасную барацьбу з элемэнтамі бюракратычнага супраціўленьня рашэньням партыі аб сьмелай і рашучай рацыяналізацыі апарату.

6. Пленум ЦКК адзначае ўзмацненьне сувязі ЦКК, жывога кіраваньня і дапамогі ў рабоце КК па мясцох, але ў той-жа час, улічваючы надзвычайна вялікія задачы ў справе ўзмацненьня партыйных радоў, барацьбу за генэральную лінію партыі супроць правааапартуністычнага ўхылу і прымірэнчых адносін да яго, супроць правай практыкі і скажэньняў у дзяржапараце,—Пленум прапануе Прэзыдыуму ў далейшай рабоце ўзмацніць гэтае кіраваньне і дапамогу АКК-РСІ, ужываючы ў прыватнасьці насылку членаў Прэзыдыуму на мейсцы на больш доўгі час у дапамогу работы КК.

7. Чыстка савецкага апарату, па папярэдніх выніках гэтай работы, не дасягнула неабходных вынікаў, з прычыны недастатковай падрыхтоўкі і недастатковага ўцягненьня шырокіх рабочых мас, слабасьці работы і ўдзелу парторганаў, прафсаюзаў і камсамолу, а таксама недастатковага падбору складу камісій па чыстцы і слабага вывучэньня стану і работы правяраемага апарату.

Пленум ЦКК, ухваляючы прынятыя Прэзыдыумам ЦКК меры па палепшаньні работы па чыстцы сав. апарату, прапануе з асобнай рашучасьцю правесьці чыстку апарату ў тых зьвеньнях, якія падвержаны разлажэньню і скажэньню клясавай лініі і паказваюць ўсім партячэйкам, прафсаюзам і камсамольскім арганізацыям на неабходнасьць шырокага і непасрэднага ўдзелу ў гэтай рабоце. Неабходна ў далейшым да пачатку чысткі суадносьнедняга сав. апарату ўдзяліць усебаковую ўвагу яго вылучэньню, пачынаючы, як правіла, чыстку нізавых сав. органаў, адначасова прыняць рашучыя меры да падрыхтоўкі зьмены вылучаных.

8. Пленум прызнае, што работа па чыстцы вясковых ячэек КП(б)Б праводзілася на падставе дырэктыў партыі ў асноўным правільна і суадпавядала пастаўленым перад чысткай задачам, аднак кіраўніцтва і жывая дапамога ў рабоце па чыстцы, як з боку ЦКК па адносінах да АКК, гэтак і з боку апошніх па адносінах да праверкомаў была недастаткова, з прычыны чаго ў радзе выпадкаў ня былі своечасова папярэджаны паасобныя недахопы ў рабоце праверкомаў і няпоўнае выяўленьне хваравітых зьявішчаў у рабоце ячэек і РК з боку некаторых праверкомаў. Адначасова Пленум канстатуе, што партыйныя камітэты слаба ўдзельнічалі ў рабоце па чыстцы партыі, лічучы гэту работу справай Кантрольных Камісій.

Чыстка сельскіх ячэек выявіла вялікую колькасьць клясава-чужых і разлажыўшыхся элемэнтаў, якія ня здольны праводзіць лінію партыі па практычнай рабоце ў вёсцы.

У далейшай рабоце па чыстцы савецкіх, вузаўскіх ячэек, АКК неабходна прыняць усебаковыя меры да таго, каб праверка і чыстка праз разгорнутую шырокую самакрытыку ня толькі садзейнічала ачышчэньню ад клясава-чужых элемэнтаў, але адначасова падвергла-б поўнаму агляду дзейнасьці ячэек, выявіла ўсе недахопы і садзейнічала паляпшэньню работы ў цэлым.

9. Аднэй з важнейшых задач КК зьяўляецца сталая і сыстэматычная праца па ажыцьцяўленьню кантролю і праверкі дырэктыў партыі і савецкага ўраду, роўна і рашэньняў КК-РСІ.

Пленум абавязвае КК-РСІ у працягу бліжэйшага часу дабіцца, каб ва ўсіх дзяржустановах і прадпрыемствах быў устаноўлены парадак вучоту рашэньняў, які забясьпечвае хуткую і штодзённую праверку іх выкананьня, арганізуючы і ўцягваючы ў праверку выкананьня дырэктыў партыі і ўраду прафсаюзы і шырокія масы.

10. Ва ўмовах абвастраньня клясавай барацьбы—правядзеньне правільнай нацыянальнай палітыкі зьяўляецца важнейшай задачай усіх партыйных і савецкіх органаў. Факты, якія выкрыты і асуджаны партыяй у выглядзе яўнага нацыянал - дэмакратызму, антыпартыйных поглядаў у пытаньнях нацыянальнай палітыкі, зьяўляюцца нічым іншым, як спробамі супраціўляючыхся сацыялістычнаму накапленьню кулацка-нэпманскіх элемэнтаў працягнуць шавіністычныя тэндэнцыі ў шэрагі нашай партыі і дзяржапарату.

Пленум ЦКК даручае Прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б у сваёй далейшай рабоце весьці самую рашучую барацьбу з малейшымі выкрыўленьнямі нацыянальнай палітыкі ўсімі зьвеньнямі парт., сав. апарату і паасобнымі партыйцамі, выкрываць і неаслабна змагацца з малейшымі праявамі антысэмітызму.

11. Пастаўленая партыяй задача сьмелага і рашучага вылучэньня і падрыхтоўкі кадраў патрабуе максымальнага ўдзелу АКК у гэтай рабоце парторганаў, усімі мерамі дапамагаючы і арганізуючы вылучэньне новых кадраў, у асаблівасьці з праявіўшых сябе актыўна ў рабоце КК РСІ па барацьбе з бюракратызмам, за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі. З другога боку, пасьпяховае выкананьне задач, што стаяць перад АКК-РСІ патрабуе значнага палепшаньня складу працаўнікоў органаў ЦКК-РСІ, таму Пленум ЦКК прапануе Прэзыдыуму ЦКК паставіць перад ЦКК КП(б)Бел. пытаньне аб мабілізацыі суадпаведных кваліфікаваных партыйна-вытрыманых працаўнікоў для работы ў органах КК-РСІ.

12. Прызнаючы, што неабходнасьць рэарганізацыі бюракратычнай сыстэмы фінкантролю ў сэнсе замены яго масавым кантролем, які ажыцьцяўляецца праз НКФ, сэкцыі саветаў і рэв. камісіі пад кіраўніцтвам органаў КК-РСІ,—у сучасны момант устаноўлена з усёй відавочнасьцю, што ўсякая затрымка з ажыцьцяўленьнем праэкту ЦКК-НКРСІ СССР затрудніе хуткае выкананьне дырэктыў XVI-й партканфэрэнцыі аб органах масавага кантролю. Пленум ЦКК лічыць неабходным неадкладна ўнесьці ў дзеяньне праэкт аб рэарганізацыі органаў фінкантролю і даручае Прэзыдыуму ЦКК унесьці гэтае пытаньне ў ЦКК УсеКП(б).

За генэральную лінію партыі

МЕНСКІ ПАРТАКТЫЎ ПАТРАБУЕ ПРЫНЯЦЬЦЯ РАШУЧЫХ МЕР У АДНОСІНАХ ПРАВЫХ УХІЛІСТАЎ. ПАРТАКТЫЎ ЗАЯЎЛЯЕ, ШТО НЕ ДАЗВОЛІЦЬ ПРАВЫМ ФРАКЦЫЯНЭРАМ ПАРУШАЦЬ АДЗІНСТВА ПАРТЫІ.

(Рэзалюцыя менскага партактыву па дакладу сэкратара ЦК КП(б)Б тав. Васілевіча аб чэрговых задачах гаспадарчага будаўніцтва і барацьбе з правым ухілам).

Заслухаўшы даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. Васілевіча аб чарговых задачах гаспадарчага будаўніцтва і барацьбе з правым ухілам, сход актыву Менскай арганізацыі КП(б)Б канстатуе, што дзякуючы правільнаму бальшавіцкаму кіраўніцтву ленінскага ЦК УсеКП(б) партыя і ўся рабочая кляса ва ўмовах складанага міжнароднага становішча, абвастронай клясавай барацьбы ўнутры краіны і аб'ектыўных гаспадарчых цяжкасьцяў, што сустракаюцца на шляху сацыялістычнага будаўніцтва нашай краіны і рэканструкцыі народнай гаспадаркі змагла мабілізаваць шырокія рабочыя, батрацкія, бядняцка-серадняцкія масы гораду і вёскі вакол задач сацыялістычнага будаўніцтва і перамогі цяжкасьцяў, зьвязаных з ім.

Лепшым сьцьвярджэньнем правільнасьці лініі партыі і яе курса на шпаркі тэмп індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сялянскай гаспадаркі зьяўляюцца вынікі выкананьня першага году пяцігодкі, якія наперакор размовам правых апартуністаў перавысілі ўсе нашы плянавыя меркаваньні.

Посьпех сацыялістычнага будаўніцтва ўвесь час забясьпечваўся непрымірымай барацьбой супроць усялякіх хістаньняў і ўхілаў ад генэральнай лініі партыі, у першую чаргу барацьбой з правым яскрава-апартуністычным ухілам начале з т. Бухарыным, а таксама з „левымі“ загібамі Шацкіна, Стэна і інш. і з прымірэнча-абывательскімі адносінамі да іх.

Плян сацыялістычнага будаўніцтва гэтага году—другога году пяцігодкі, вызначаны ў кантрольных лічбах на 29-30 год у сваіх асноўных паказальніках, перавышае тэмпы разьвіцьця мінулага году і тэмпы вызначаныя пяцігодкай. Гэта дае магчымасьць ставіць пытаньне аб выкананьні пяцігодкі ў карацейшы тэрмін, што магчыма толькі пры ўмовах напружанасьці сіл, энэргіі і волі ўсяе партыі, усяе рабочае клясы і далейшага ўздыму энтузіязму шырокіх працоўных мас вакол вырашэньня гаспадарчых і палітычных задач, зьвязаных з пабудовай сацыялізму.

Сход з абурэньнем адзначае, што правыя ўхілісты ў КП(б)Б, ня гледзячы на жорсткую і непрымірымую барацьбу ЦК і ўсёй КП(б)Б з прыпічэпаўшчынай, правымі дзеяньнямі НК Асьветы і інш. арыентуюцца на бухарынскую апазіцыю, ня спыняюць антыпартыйнай дзейнасьці, аб чым сьведчыць іх імкненьне скарыстаць чыстку тав. Жылуновіча для нападу на лінію партыі і папулярызацыю нацыянал-дэмакратычных ідэй. Партактыў патрабуе ад ЦК КП(б)Б прыняцьця самых рашучых мер да ўсіх тых, хто не падпарадкоўецца рашэньням партыі.

Сход канстатуе, што правая бухарынская апазіцыя, ня гледзячы на сурёзныя і неадпаразовыя папярэджаньні з боку партыі, а таксама, што жыцьцё абвергнула ўсе прапітулянцкія погляды па асноўных пытаньнях нашай палітыкі, ня толькі адмовіліся ад іх, а паадварот працягваюць настайваць на ўсіх сваіх памылках і імкнуцца арганізаваць аформіць правыя групы ў радох партыі, аб чым яскрава сьведчаць апошнія выступленьні староннікаў Бухарына, Айхенвальда, Сьляпкова і іншых, процьць ленінскага кіраўніцтва партыі. Партактыў настайвае на прыняцьці самых рашучых мер для таго, каб спыніць недапушчальную фракцыйную барацьбу правых супроць партыі і Камінтэрну.

Партактыў патрабуе прымяненьня да фракцыянэраў неабходных арганізацыйных мер, вызначаных Красным пленумам ЦК УсеКП(б) і пленумам ІКК; побач з гэтым і актыўу рашуча ганьбіць „левыя“ выступленьні Шацкіна, Стэна і інш., паўтараюць старую трацкісцкую хітрасьць пю на партыю і імкнуцца супраціўляцца ставіць камсамол партыі. Актыў заклікае ўсю партарганізацыю вокал ленінскага ЦК і заяўляе, што як і раней вернай апорай бальшавіцкага шляху ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б у выкананьні сацыялістычнага будаўніцтва і барацьбе з ухіламі ад генэральнай лініі партыі.

І. УНШЛІХ

Работніца і сялянка--на дапамогу справе абароны Савецкага Саюзу.

У падрыхтоўцы краіны да абароны павінны актыўна ўдзельнічаць тры пакаленьні: дзеці, моладзь і дарослыя. У ёй павінна прыняць актыўны ўдзел і працоўная жанчына.

Роля жанчыны ў справе сацыялістычнага будаўніцтва, у справе абароны павінна быць у шмат разоў больш значнай, чымся цяпер.

У шэрагах ТДА-Авіяхіму да канца 1928 г. было звыш 700 тыс. працоўных жанчын (17,5 агульнае колькасьці членаў грамады). Мелася 149 жаночых гурткоў сувязі, 45 курсаў сувязі адміністрацыйна - гаспадарчай службы, 399 розных іншых гурткоў.

Усяго на агульнай і жаночай сетцы гурткоў і курсаў ТДА-Авіяхіму працавала 100.000 жанчын. У нас няма яшчэ дакладных даных аб прыросьце колькасьці жанчын у шэрагах ТДА-Авіяхіму на працягу бягучага году, бязумоўна, гэта колькасьць перавышае **адзін міліён**.

Відавочныя посьпехі ў гэтай галіне нас задаволіць ня могуць, асабліва ўлічваючы непасрэдную пагрозу новай вайны.

Цікава прасачыць, якая праца па падрыхтоўцы жанчыны да актыўнага ўдзелу ў вайне праводзіцца ў Польшчы. У польскай арганізацыі фізычнага выхаваньня і ваеннай падрыхтоўкі пры мясцовых аддзяленьнях у 1927-28 г. арганізаваны спэцыяльныя жаночыя бюро і адчынен шэраг курсаў па падрыхтоўцы інструктароў-жанчын. Гэтая-ж арганізацыя пэрыядычна адчыняе курсы для падрыхтоўкі жанчын да выкананьня розных службаў у арміі: курсы канцэлярскіх працаўнікоў, інтэнданцкіх служачых, пекароў, паваароў — у Варшаве, Люблінe і ў шэрагу іншых гарадоў. У польскім саюзе скаутаў, водлуг даных 1927 г., мелася каля 15300 гарцэрак, арганізаваных у 542 дружыны. Бязумоўна, што ў ваенны час вядомыя катэгоры жаночага насельніцтва будуць прыцягнуты да працы для патрэб арміі ў абавязковым парадку.

Ва ўсіх гэтых прыкладах прадугледжваецца прыцягненьне жанчын, галоўным чынам, да тылавой службы. Доступ жанчыне да службы ў страю ў буржуазных арміях быў - зусім забаронен. Аднак за апошні час намячаюцца і тут некаторыя зьмены ў зьвязку з фармаваньнем фашысцкіх вайсковых арганізацый. Навучаньне жанчын-фашыстак страляніне і вайсковай справе пачынае ўсё шырэй і шырэй разгортвацца ў капіталістычных краінах.

Неабходна мець на ўвазе, што па мабілізацыі значны процант рабочых павінен будзе пайсьці з фабрык і заводаў на фронт. Замена выбыўшых рабочых у вялікай меры павінна быць праведзена ніляхам прыцягненьня новых кадраў работніц, ва ўсіх галінах прамысловасьці, працуючых на абарону.

Трэба яшчэ ў мірны час улічыць неабходнасьць замены (з пачаткам ваенных дзеяньняў) часткі кваліфікаваных рабочых работніцамі, загадзя ўзмацніць падрыхтоўку жаночай кваліфікаванай рабочай сілы, прадугледзіць прыцягненьне жанчын-работніц больш высокім процанце на прадпрыемствы цяжкае індустрыі і вае... прамысловасьці. Павінна быць заг... арганізавана сыстэматычнае садзе... чаньне працоўным жанчынам, жа... чым набыць кваліфікацыю для пр... ў тых галінах прамысловасьці, ... зьвязаны з абаронай.

Мы ўзялі пакуль адзін бок... таньня, зьвязанага з удзелам жа... ны ў справе падрыхтоўкі прамы... васьці да абароны. Неабходна, ад... улічыць, што ўжо цяпер работ... грае значную ролю ў прамысловас... складаючы па колькасьці больш... чвэртку ўсяго ліку рабочых фабр... на-заводзкае прамысловасьці. Пра... у важнейшых галінах цяжкае і... стрыі процант тэты значна зьніж... ца (у прамысловасьці па апрацо... мэталяў да 11,6 проц.), але ў ... стыльнай прамысловасьці ён у а... ных галінах павышаецца да 64 п...

Пытаньні разьвіцьця цяжкае і... стрыі, аўтабудаўніцтва, маторыза... краіны, а таксама і трактарабуд... ніцтва, авіяцыйнай і хімічнай пра... словасьці адчуваюць патрэбу для ... сьпяховага вырашэньня ў гара... прыхільніках справы індустрыя... цыі і абароны, і бязумоўна, шт... першых шэрагах арганізатараў ма... вае ініцыятывы будзе тут жанчы... работніца.

Побач з работніцай у гэтых шэ... гах павінна стаць і сялянка. Сяля... павінна зрабіцца актыўнай прапаг... дысткай ідэй абароны ў шчыльн... сувязі з агульнымі задачамі сацыя... стычнай рэканструкцыі сельскае і... надаркі.

69,6 проц. усяе нашае арміі ск... даецца з сялян. У ваенны час г... процант, бязумоўна, вырастае. Вы... наньне сельска-гаспадарчых работ... часе вайны прыпадае, такім чын... на долю сялянкі. Вялізарны рост ... шых савгасаў і калгасаў патра... кадраў сялянак, якія умеюць ... стасаваць да працы сельска-гаспад... чыя машыны, трактары.

Палітычная сьвядомасьць сялян... выразнае разуменьне ёю задач абар... ны сацыялістычнай бацькаўшчы... супроць спробаў абшарнікаў і фабр... кантаў аднавіць прыгоньніцкі ла... нашай краіне, адыграе вялізарн... ролю, як у справе падрыхтоўкі СС... да абароны, так і ў момант узьні... неньня ваенных дзеяньняў.

Цэнтр пяжару ТДА-Авіяхімаўск... працы ўсё ў большай меры павін... пераносіцца на вёску.

Усяго ў стралковыя гурткі ўцягн... та 17 проц. жанчын у адносіне... агульнае колькасьці стралкоў.

У будучых баявых сутычках рабо... ніцы і сялянкі, скончыўшыя шко... вайсковага навучаньня, будуць біц... са зброяй у руках з байцамі РСЧА.

Пад кіраўніцтвам партыі, у шэр... гох ТДА-Авіяхіму работніца, батрачк... бяднячка, сераднячка выканае параўн... з мужчынай стаячыя перад намі вял... кія, неадкладныя задачы, як на ўн... траным фронце сацыялістычнага б... даўніцтва, так і на фронце ўзброен... барацьбы з усімі нашымі ворагамі.

Адзін з самых магутных атрад... савецкае грамадзкасьці—ТДА-Авіяхім... навінен у вялікай ступені паглыбіць ... пашырыць сваю працу.

Пяць міліёнаў членаў ТДА-Авіях... му, з іх толькі адзін міліён жанчын... такая колькасьць нас задаволіць н... можа.

Наш мінімальны пяцігадовы плян:

10 міліёнаў членаў грамады... з іх 5 міліёнаў жанчын.

З усёй энэргіяй возьмемся за вы... кананьне гэтай праграмы. **Даможам... ся таго, каб да канца пяцігодк... 5 міліёнаў рабочых і сялянак і... міліёнаў працоўных жанчын был... лепшымі будаўнікамі сацыялізму... лепшымі байцамі на ўзброеным... фронце абароны сацыялістычнай... бацькаўшчыны.**

ВЫКАНАЕМ ПЛЯН ЗАГАТОЎКІ БУЛЬБЫ І ХЛЕБА.

Арганізуем грамадзкасьць у справе падрыхтоўкі складаў для хаваньня бульбы.—Прымусім кулакоў і заможнікаў датэрмінова выканаць вызначаныя нормы па хлебазагатоўках.

Ня зыходзіць з клясавых рэек.

Загатоўка бульбы падыходзіць да канца. У шмат якіх мясцох пляны выкананы поўнасьцю, а ў некаторых са значным перавышэньнем. Але ўсётакі яшчэ ня позна зьвярнуць увагу нашых загатавіцеляў на выпадкі скрыўленьня клясавай лініі, якія досыць часта сустракаюцца ў практыцы правядзеньня ў жыцьцё плянаў загатовак.

Нам прышлося сустрэць у **Дрыбінскім раёне, Аршанскай акругі** такое зьявішча. Бульбазагатоўкі праводзяцца не па клясаваму прынцыпу, а па колькаснаму. Гэта знача, што бядняк, маючы, да прыкладу, чатыры дзесяціны зямлі, калі ён у гэтым годзе засеяў дзьве дзесяціны бульбай, павінен здаць такую-ж колькасьць бульбы, як і моцны сераднік, маючы 8-10 дзесяцін зямлі, але засеяўшы таксама дзьве дзесяціны бульбай.

Вядома, гэта няправільна. Дрыбінскім таварышам неабходна ўлічыць гэту сур'ёзную памылку і зараз-жа яе выправіць. Трэба памятаць, што ўся цяжкасьць бульбазагатовак павінна легчы на кулацкія і заможныя гаспадаркі, а не на бядняцкія і маламоцныя, хаця-б і з павялічаным засевам бульбы за лік другіх культур. Падатковая палітыка не павінна мець разыходжаньня з бульба-загатоўчай—усюды неабходна прытрымлівацца клясавага прынцыпу ды і к таму-ж трэба памятаваць, што бядняцкія і сераднякія гаспадаркі ўдзельнічаюць у бульбазагатоўках у парадку добраахвотнасьці і сацыялістычнага спаборніцтва.

У іншых мясцох мы маем выпадкі „ураўнілаўкі“. Вось, напрыклад: у вёсцы Мацкевічы, Бабруйскай акругі за лік недаабкладаньня кулакоў пераабкладзены беднякі і маламоцныя сераднякі. Кулаку—арандатару млына—Каражанцу спачатку было намечана 80 пудоў, а потым з яго зьнялі 20 пудоў і расклалі паміж беднякамі Папельскім Янкам, які мае 2,25 дзесяціны зямлі і 2 едакі і Папельскім Цімохам, у якога яшчэ горшая гаспадарка. Кулаку-млынару было накладзена 50 пудоў, а потым зьнята 25 пудоў. Абкладваліся і такія бядняцкія гаспадаркі, якія зводны ад падатку.

Загатоўкі—важная кампанія, а таму мы павінны асабліва асьцярожна і, разам з тым, рашуча ажыцьцяўляць бульбазагатоўчыя пляны.

Факты з Аршаншчыны і Бабруйшчыны сыгналізуюць аб вялікіх недахопах у гэтай галіне.

№.

Камсамольцы накіравалі эшалён бульбы.

6 лістапада накіроан у Маскву на імя ЦК ЛКСМ эшалён бульбы, які быў загатоўлен камсамольскімі брыгадамі. Для пагрузкі былі мабілізаваны камсамольцы 1-га і 2-га райёнаў. З эшалёнам у Маскву выехала дэлегацыя ў ліку 42 чалавек.

У.

Сынагогу—пад хлебазагатоўчы склад.

Вялікі недахоп у загатоўчай кампаніі—адсутнасьць памяшканьняў,—куды-б можна было сьмела сыпаць жыта і бульбу.

— Такім памяшканьнем можа зьявіцца сынагога,—так вырашыла насельніцтва мястэчку Старобін. Сказана—зроблена. Усё працоўнае насельніцтва пастанавіла аддаць сынагогу пад склад на хлеб і бульбу.

Пасьля таго, як сынагога аслабаніцца ад жыта і бульбы, зробяць у ёй клюб.

Селькор.

Кулакі атрымалі адпор.

(Ст. Дароскі р., Меншчына).

У Крыважосаўскім сельсавеце за невыкананьне пастаноў агульных сходаў аб здачы хлеба кулакі Пархімовіч Янка, Трус Раман, Чачуха Пряся, асуджаны народным судом і пазбаўлены волі на значныя тэрміны. Акрамя гэтага на іх накладзены штраф у суме 1550 руб.

Бядняцка-сераднякая частка вёскі засталася здаволена пастановай суду.

Маліна.

Толькі 1½ проц.

Загатоўка ільна-валакна на Віцебшчыне ідзе пакуль што слаба. У кастрычніку плян загатоўкі выкананы ня значнай колькасьці. Асабліва дрэнна абстаіць справа з узысканьнем закантрактаванай ільно-прадукцыі. Ёсьць небясьпека, што своечасова ўся закантрактаваная колькасьць ня будзе сабрана. Па 30 кастрычніка паступіла **ўсяго толькі 1½ проц.** закантрактаванага ільну. Прычына ў тым, што няма належнага кантролю і актыўнасьці з боку крэдытных таварыстваў.

Ул. Буслаў.

Правялі тыднёвік збору мяшкоў.

(Ліст з Полацку).

1 лістапада скончыўся „тыднёвік збору мяшкоў“ па г. Полацку, які праводзіўся па непасрэднай ініцыятыве гарадзкога савету і акругкому камсамолу.

Паміж камсамольскімі ячэйкамі былі разьмеркаваны вуліцы, прычым да гэтай справы былі прыцягнуты піанэры і вучні. Адна толькі ячэйка будаўнікоў сабрала 400 мяшкоў. Сем камсамольскіх брыгад сабралі 1000 мяшкоў.

С.

Пад суд за зрыў хлебазагатовак

За зрыў заданьня па хлебазагатоўкам, збору палявых і спэцыяльных капіталаў, арганізацыі датэрміновай здачы с.-г. крэдыту і адсутнасьць работы па спагнаньню пратэрміновак, пагражаючае становішча з паступленьнем закантрактаванай прадукцыі, за адсутнасьць работы з беднатой і наогул з каапэрацыйным актывам, за безгаспадарчасьць і безадказнасьць у працы, аб'яднаным пасьлядзяньнем Аршанскага Акрсельсаюзу і Акрсельбанку вынесена пастанова аб зьняцьці з працы старшынь Межаўскага і Бобрскага с.-г. крэдытных т-ваў, якія акрамя гэтага аддаюцца пад суд. Рэвізыйнай камісіі і савету Бобрскага с.-г. кр. т-ва за несваечасовае рэагіраваньне і няпрыняцьце адпаведных крокаў абвешчана суровая вымова з папярэджаньнем.

За няпрыняцьце мер па практычнаму ажыцьцяўленьню дырэктыў партыі ў галіне ўзмацненьня тэмпу калектывізацыі сельскае гаспадаркі, вытворчага каапэрыраваньня бядняцка-сераднякай часткі вёскі, за нескарыстаньне фонду каапэрыраваньня і крэдытаваньня беднаты, накіраваньне ў пераважнай большасьці крэдытаў у паасобныя гаспадаркі, перавышэньне ўстаноўленых НКГ цэн на с.-г. машыны, за зрыў выкананьня плянаў хлебазагатовак і спагнаньня закантрактаванай прадукцыі, перавышэньне адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў, за безгаспадарчасьць, старшыня праўленьня Горацкага с.-г. кр. т-ва Цітавец зьняты з працы і разам з усім складам працаўнікоў аддаецца пад суд.

Белавусаў.

Загатоўцы не падрыхтаваны да прыёму бульбы.

На ст. Слаўнае 26-га кастрычніка пачала масава паступаць бульба з ваколічных сельсаветаў. За дзень было прынята 7.000 пуд. Тольскае і Слаўнаскае спажывецкія таварыствы арганізавана падрыхтаваліся да прыёмкі бульбы. Сялян не затрымлівалі, бо рабочыя арцелі працавалі пасьпяхова, прыймаючы бульбу з вагі.

Але вось іншыя загатоўцы зусім дрэнна падрыхтаваліся. Старшыня Вобчацкага спажывецкага таварыства тав. Бараўскі толькі ў дзень пагрузкі бульбы даў заяўку на вагоны, і калі з вялікай цяжкасьцю начальнік станцыі даў вагоны, дык усіх не нагрузілі, бо ён не паклапаціўся аб людзях і ня было каму грузіць вагоны. Прыёмка ім бульбы праводзілася не арганізавана, у выніку трымалі сялян да 7 гадзін вечару, якія прыехалі за 30 вёрст, з Чарэйскага раёну. Таксама ён не паклапаціўся, каб навяць грузчыкаў: грузілі самі сяляне ў вагоны, а ў зьвязку з гэтым ім павышалі цану на бульбу да 51 кап. за пуд.

Пагрузка бульбы ў вагоны праводзілася бяз тэхнічнага нагляду, ня былі пастаўлены шчыты пры дзьвярах у вагонах. Таксама загатоўца Бараўскі адмовіўся прыймаць ад сялян неадборную бульбу і гэта выклікала вялікае нездавальненьне з боку сялян. У гэту справу ўмяшаўся прадстаўнік АВК і тады толькі пачалі прыймаць усю прывезеную бульбу.

Зусім нядбайныя адносіны да загатоўкі бульбы былі дапушчаны з боку Ухвальскага спажывецкага таварыства. Сяляне прывезьлі бульбу на ст. Слаўнае, а загатоўца не зьявіўся і прыбыў толькі ўначы і то без в

МЕНСК У ДНІ КАСТРЫЧНІКАВЫХ УРАЧЫСТАСЬЦЯЎ.

УРАЧЫСТЫ ПЛЕНУМ МЕНСКАГА ГАРСАВЕТУ.

На лістапада, а 7-й гадзіне ўвечары ...ыкальні БДТ адбылося ўрачыстае ...жэнне пленуму Менскага гарсавету, прысвечанае 12-й гадавіне Кастрычніка...й рэвалюцыі.

...тры паверхі будынку тэатру былі ...поўнены. Шмат было гасьцей—прадстаўнікоў ад розных арганізацый.

...ступ прамовай выступіў старшыня гарсавету т. Акеючыц, які спыніў...наших дасягненьнях ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

...ршыня СНК БССР т. Галадзед зрабіў даклад аб міжнародным і ўнутраным ...ітуцыі, у якім усебакова асьвяціў ...моўца,—зьяўляецца школай сацыялістычнага будаўніцтва. У вайсковых частках з чырвонаармейцаў рыхтуюцца працаўнікі сельсаветаў, калгасаў і г. д. Але мы заўсёды памятаем аб нашай непасрэднай задачы—цільна сачыць за савецкай мяжой. Чырвоная армія гатова ў кожны момант даць рашучы адпор ворагу, які пасьмее пераступіць нашу мяжу.

Кіраўнік трамвайнага будаўніцтва т. Кадушын паведаміў пленум аб ходзе трамвайнага будаўніцтва і адзначыў, што трамвайная лінія на Пярэспу, дзякуючы энтузіязму рабочых і тэхнічнага пэрсаналу, была скончана на 2 месяцы раней, што ў выніку дало гарсавету звыш 30.000 руб. чыстага прыбытку зз эксплёатацыю гэтай лініі. Рабочыя і тэхнікі трамвайнага будаўніцтва падпісалі гэты падарунак да 12-й гадавіны Кастрычніка—рэвалюцыі.

На дакладу т. Галадзеда пленум прыняў рэзалюцыю, у якой зазначаецца, што 12-ты год пралетарскай дыктатуры працоўных СССР сустракаюць пры ўмовах разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва.

Пленум гарсавету заклікае працоўных яшчэ больш згуртавацца навокал партыі Леніна пад лёзунгам цьвёрдага і рашучага правядзеньня генэральнай лініі партыі. У рэзалюцыі на дакладу т. Кадушына пленум выказаў падзяку рабочым і тэхнікам трамвайнага будаўніцтва за ўзмоцненую работу па правядзеньню трамвайнай лініі.

Пленум паслаў прывітаньні: ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б і Асобнай Далёка-Усходняй арміі.



РАБОЧЫЯ МЗБ ДА XII ГАДАВІНЫ ЗВЫШ НОРМЫ АДРАМАНТАВАЛІ 10 ТАВАРНЫХ І 2 ПАСАЖЫРСКІХ ВАГОНАЎ.

Урачыстасьць перамог...

(З усесаюзнай радыё-пераклічкі).

Алё... Алё... Гаворыць Масква...

—Працоўныя СССР уступаюць у трынаццаты год сацыялістычнага будаўніцтва. Нічым ня вымераць небачаны тэмп працы, напружанае волі да перамогі...

Эфір усхваляваны, з хутчэйшаю шалёнкі разносіць навокал усёй зямной кулі урачыстасьць пралетарыяту Савецкага Саюзу...

— Рабочыя ўсіх краін сьвету, рабочыя гарадоў Эўропы, Азіі, Амэрыкі, слухайце, што адбываецца па гарадох СССР.

Рабочыя і сяляне СССР зараз дэманструюць сваю салідарнасьць, сваю волю, накіраваную на ўзмацненьне будаўніцтва сацыялізму...

— Кожны горад адзначае XII гадавіну Вялікага Кастрычніка пускам новых фабрык, заводаў, цэхаў...

— У кожным горадзе адзінай у сьвеце рэспублікі працы сёньня адбываюцца парады Чырвонай армії, дэманстрацыі працоўных.

Чырвоная армія на Далёкім Усходзе сёньня яшчэ раз заўважае, што яна адстаіць савецкія межы...

Слухайце, слухайце...

Пяцігодку закончыць у чатыры гады,—заўважаюць рабочыя Ленінграду. Ленінград падтрымоўваюць рабочыя ўсіх гарадоў СССР.

Намечаныя тэмпы будаўніцтва сацыялізму не здавальняюць рабочую масу. Яна ўрачыста заўважае свайму правадыру—камуністычнай партыі, што гэты тэмп узмацніць...

Сёньня ў Харкаве загарыцца лямпачка Ільіча ад укоў адбудаванай электрастанцыі.

Арцёмаўск, Краснадар, Ніжні-Ноўгарад, Тыфліс, Менск, Сарапул, Ленінград і іншыя гарады сёньня даложаць аб вялізарных посьпехах у будаўніцтве сацыялізму...

Усюды, усюды Кастрычнікаўскія перамогі... Усюды ў СССР сёньня Кастрычнікаўскія ўрачыстасьці..

***

Слухайце... Слухайце, рабочыя ўсяго сьвету... Слухайце, прыгнечаныя калёніі імпэрыялістычных дзяржаў...

Слухайце і вучыцеся... Уключаем Чырвоны Пляц—Усесаюзны цэнтр сёньняшняй урачыстасьці...

У тэлефонную трубку чуюцца гукі музыкі, бадзёрыя песьні, мільённае ура маскоўскіх рабочых.

— Вось паехала артылерыя, у паветры над Чырвоным Пляцам рэпіць эскадрыльлі самалётаў... Чырвоная армія дэманструе сваю моц перад пралетарыятам Масквы...

З сьцягаў, з бясконцымі плякатамі праходзяць рабочыя атрады з усіх раёнаў Масквы.

Вось ідуць рабочыя заводу „Серп і Молат", на плякатах чырвоных мэталістаў абяцаньне падвоіць выпуск машын для калектывізацыі сельскай гаспадаркі...

За разгортваньне пралетарскай самакрытыкі!

Няхай жыве шчыльная сувязь рабочых і сялян!

За культурную рэвалюцыю!

За яшчэ большае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва!

Лёзунгі ідуць члены Ураду СССР.

Магутнае ўра, бясконцае ўра чуецца ў трубку тэлефону.

Гэтую неперадаваемую ўрачыстасьць слухаюць мільёны рабочых усяго сьвету і яна дае ім упэўненасьць перамогі ў набліжаючыхся вялізарных баёх пралетарыяту з капіталізмам...

***

Слухайце... Слухайце, слова даецца Ленінграду...

Чырвоны Ленінград рапартуе перад усім сьветам аб сваіх перамогах.

— Ленінградзкія рабочыя высока трымаюць сьцяг пераможнай бальшавіцкай пяцігодкі...

„Красный Путиловец" дасьць у бягучым годзе 10000 трактараў, а такі выпуск намячаўся на апошні год пяцігодкі...

— Ленінградзкія заводы селёта выпусьцяць першыя волаты марскога суднаходства...

— „Іжэвский" завод выпусьціў 34 камплекты алмазнага буравога абсталяваньня, якое раней увозілася з-заграніцы.

Энтузіязм пралетарыяту, які не ўлічвалі правыя ўхілісты, даў магчымасьць яшчэ больш узмацніць тэмп будаўніцтва—так гаворыць з Ленінграду, Масквы, Іванава-Вазьнясенску, Тыфлісу, Менску, Харкава, так гаварылі рабочыя ва ўсіх гарадох Саюзу у дзень 12-й гадавіны Кастрычніка.

***

Ад рабочых і сялян Савецкай Беларусі слова мае старшыня СНК БССР т. Галадзед...

— Таварышы рабочыя і сяляне Савецкага Саюзу дазвольце прывітаць вас ад імя працоўных тэй рэспублікі, якая знаходзіцца на мяжы з капіталістычным сьветам.

— Рабочыя і сяляне БССР будуюць сацыялізм пры дапамозе ўсяго Савецкага Саюзу.

Да вайны Беларусь ня мала сваёй прамысловасьці, цяпер яна стаіць на шляху буйнага электрабудаўніцтва. Савецкая Беларусь будуе буйныя фабрыкі і заводы. Мы маем вялізарныя посьпехі ў справе ўзмацненьня сацыялістычных пазіцый у сельскай гаспадарцы. З 934 калгасаў мы за год дайшлі да 1715 калгасаў.

***

У Дзень XII гадавіны Вялікага Кастрычніка рабочыя і сяляне СССР перад тварам усяго сьвету адзінадушна заявілі, што яны добра ўсвоілі і яўхільна праводзяць лінію Ленінскай партыі бальшавікоў. Правыя ўхілісты і розманяровыя нацыі былі ў гэты дзень яшчэ раз моцна біты ў іх нявер'ї ў непераможныя сілы рабочае клясы, былі біты начуваныя тэмпамі нашага будаўніцтва.

В. ЗАЙЦАЎ.



ДЭЛЕГАЦЫЯ БЫЛЫХ ЧЫРВОНЫХ ПАРТЫЗАНАЎ У МЕНСКУ (У ЦЭНТРЫ ТАВ. СЛАВІНСКІ).

...льённае ура працоўных СССР.

...ны сонечны дзень, на небе ані ...і, ані воблачка. Менск чырвоны...цягамі, плякатамі з шматлікімі ...гамі, з самай раніцы гаварыў, ...7 лістапада ня звычайны дзень ...абочае клясы, а вялікае сьвята ...ог на фронце будаўніцтва сацы...у.

...ніколі ўдалася ў гэты дзень ...страцыя, у якой прынялі дзесяткі ...сяч працоўных Менску. Трэба ...і вітаць ідэю аб наладжваньні дэ...рацыі па прыкладу Масквы. Амаль ...гадзіны міма трыбуны на Пляцу ...праходзілі ўсё новыя і новыя ка...рабочых і служачых менскіх прад...прыемстваў і ўстаноў.

...дзёрыя маршы аркестраў, рэвалю...ныя песьні дэманстрантаў яшчэ ...і надымалі сьвяточны настрой ...ўпага насельніцтва Менску.

...ўпрыгожанай да сьвята трыбуне ...і Беларускага Ураду, а таксама ...таўнікі вышэйшых партыйных і ...саюзных арганізацый.

Няхай жыве XII гадавіна!

...адказ магутнае ўра праходзячай ...трыбуны калёны.

...а сплашную калектывізацыю сель...гаспадаркі!

...е, як адзін, у сацыялістычнае спа...ніцтва!

...зсцярым нашу энэргію на выка...ю пяцігадовага пляну сацыялі...нага будаўніцтва!

...і тэмп росту БССР пры дыктату...ролятарыяту. Наступныя лічбы ясна ...дэманструюць тэмп гэтага росту: ...4-25 г. бюджэт БССР складаў 12 ...аў руб., а ў 1929-30 г.—135-137 ...аў руб. За апошні год бюджэт ...павялічыўся на 40 міл. руб.

...рывітаньнем ад працоўных Літвы ...ніў прадстаўнік літоўскай сэкцыі ...у тав. Дубаў. У той час, як пра...я Савецкага Саюзу,—кажа т. Ду...пад кіраўніцтвам камуністычнай і дабіўся вялікіх посьпехаў, шыро...згортваюць сацыялістычнае будаў...—у капіталістычных краінах нара...ь новыя клясавыя бойкі і кляса...упярэчнасьці паміж працай і капі...

...саюзу харчавікоў пленум вітаў ...чар, Тав. Рузін вітаў пленум ад ...рвонаармейскіх часьцей г. Менску. ...Наша Чырвоная армія,—заявіў пра...моўца,—зьяўляецца школай сацыялістычнага будаўніцтва. У вайсковых частках з чырвонаармейцаў рыхтуюцца працаўнікі сельсаветаў, калгасаў і г. д. Але мы заўсёды памятаем аб нашай непасрэднай задачы—цільна сачыць за савецкай мяжой. Чырвоная армія гатова ў кожны момант даць рашучы адпор ворагу, які пасьмее пераступіць нашу мяжу.

Кіраўнік трамвайнага будаўніцтва т. Кадушын паведаміў пленум аб ходзе трамвайнага будаўніцтва і адзначыў, што трамвайная лінія на Пярэспу, дзякуючы энтузіязму рабочых і тэхнічнага пэрсаналу, была скончана на 2 месяцы раней, што ў выніку дало гарсавету звыш

Лёзунг зьменяецца лёзунгам, атрад працоўных—атрадам чырвоных байцоў, а калёны ўсё рушацца і рушацца. Ці зьмесьціў-бы ў тры разы больш пляц усіх тых, хто ў гэты дзень стройнымі шэрагамі працоў міма трыбуны на Пляцу Волі?

Не, не зьмясьціў-бы, бо цэлых тры гадзіны непарыўнай стужкай рухаліся міма трыбуны ўсё новыя і новыя атрады рабочых, чырвонаармейцаў і служачых. Мора галоў, мора плякатаў і сьцягаў.

Маршы музыкі зьмяняліся сьпевамі рэвалюцыйных песьняў. Бесконцае, магутнае ура ўвесь час пераліваласа на Пляцу.

Гучна-гаварыцелі перадавалі Ўсесаюзную пераклічку. Ура маскоўскіх рабочых замянялася Ленінградзкімі, Іванава-Вазьнясенскімі, Тыфліскімі, Харкаўскімі і іншых гарадоў Вялікага Саюзу.

Эфір быў напоўнен воклікамі ўрачыстасьці пралетарыяту СССР, сьвяткуючага сваю перамогу на фронце індустрыялізацыі краіны, на фронце калектывізацыі сельскай гаспадаркі, на ўсім фронце сацыялістычнага будаўніцтва...

Мільённае ура ўсяго працоўнага СССР, ура мільёнаў рабочых і сялян Саюзу працы заклікала да далейшых перамог, да яшчэ большага ўзмацненьня тэмпаў будаўніцтва сацыялізму.

В. П—ны.

Заўжды гатовы!

17тысячная дэманстрацыя дзяцей працоўных.

На вуліцах дзеці...

Мігцяць чырвоныя гальштукі. Ільлюцца вясёлыя дзіцячыя сьпевы...

Сёньня 8 кастрычніка—у другі дзень сьвята XII гадавіны дзеці працоўных Менску дэманструюць сваю гатоўнасьць быць у перадавых шэрагах у барацьбе за сацыялістычную перабудову краіны.

Пад раўмарную дроб барабанаў праходзяць дзіцячыя калёны.

Іх вітаюць прадстаўнікі партыі, улады, камсамолу:

— Дапамагчы выкананьню пяцігадовага пляну!

— Узьняць пасьпяховасьць навучаньня ў школах.

— Да ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны.

— Будзьце гатовы!

Гучным рэхам звонкі адказ дзяцей:

— З ўжды гатовы!

М.

Усім Акруговым Выканаўчым Камітэтам БССР

Аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі камітэтаў сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі.

Сялянскія таварыствы ўзаемадапамогі, як масавыя батрацка-бядняцка-серадняцкія арганізацыі, ажыцьцяўляюць задачы дапамогі і ўзаемадапамогі, актыўна дапамагаюць ажыцьцяўленьню палітыкі Савецкай улады на вёсцы па сацыялістычнай перабудове вёскі на аснове разьвіцьця грамадзкай самадзейнасьці.

У нэтах далейшага паляпшаньня і ажыўленьня агульнай працы сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі, у сувязі з надыходзячай у сьнежані і студзені мес. справаздачна-перавыбарчай кампаніі камітэтаў сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР прапануе:

1. Перавыбары органаў сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі ператварыць у масавую грамадзка-палітычную кампанію, прыняўшы неабходныя меры да арганізаванага і актыўнага ўдзелу ў гэтай кампаніі шырокіх працоўных мас вёскі, у першую чаргу батрацтва і беднаты, шляхам папярэдняга абмеркаваньня на сходах беднаты практычных пытаньняў працы камітэтаў і самой кампаніі.

2. З нэтай прыцягненьня сялянскай масы да дзелавой крытыкі працы камітэтаў правесьці шырокую справаздачную працу на перавыбарчых сходах, з абавязковай пастаноўкай на гэтых сходах як дакладаў камітэтаў, гэтак і рэвізійных камісій.

3. Пры абгаварэньні справаздач завастрыць увагу сялянскай грамадзкасьці на асноўных пытаньнях працы камітэтаў сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі, як-та: садзейнічаньне масавай калектывізацыі і вытворчаму капэраваньню бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, разьвіцьцё гаспадарча-вытворчай дзейнасьці, стварэньне грамадзкіх запашак і насенных фондаў, аказаньне дапамогі і ўзаемадапамогі грамадзкімі прадпрыемствамі і сельска-гаспадарчымі машынамі бядняцкім і незаможна-серадняцкім гаспадаркам, у асаблівасьці інвалідам грамадзянскай вайны, сем'ям загінуўшых на фронце, чырвоным партызанам, сем'ям чырвонаармейцаў.

4. Аказаць неабходнае арганізацыйнае і матар'яльнае садзейнічаньне Камітэтам Сялянскіх Таварыстваў Узаемадапамогі ў правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі (выдзяленьне сваіх прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі, пасылка ўпаўнаважаных і г. д.), даўшы раённым выканаўчым камітэтам і сельскім саветам адпаведныя паказаньні аб неабходнасьці далейшага ўзмацненьня сялянскай узаемадапамогі.

5. Заслухаць даклады адпаведных камітэтаў сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі аб іх працы з часу апошніх выбараў, абмеркаваўшы пры гэтым плян правядзеньня перавыбарчай кампаніі і далейшыя задачы іх працы.

6. Адначасова праверыць у якой ступені ажыцьцёўлены: пастанова СНК БССР ад 14-га чэрвеня 1928 г. па дакладу Цэнтральнага камітэту Сялянскіх Таварыстваў Узаемадапамогі і пастанова III-й Сэсіі ЦВК БССР VIII-га скліканьня па садакладу Цэнтральнага Камітэту сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі ў напрамку ўсямернага ўзмацненьня органаў сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі, узмацненьня грамадзка-масавай і гаспадарча-вытворчай працы.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацневіч.

1-га лістапада 1929 г. г. Менск.

Пэрспэктывы разьвіцьця прамысловасьці БССР.

Прайшло 12 год са дня Вялікага Кастрычніка.

Пройдзены этап з усёй яскравасьцю паказаў, што ў БССР, у абставінах цяжкіх і складаных, пастаўленыя задачы сацыялістычнага будаўніцтва вырашаюцца пайленным чынам пад кіраўніцтвам КП(б)Б.

Першы год пяцігадовага пляну пройдзен з вялікім посьпехам. Само жыцьцё абвергнула пэсімістычныя разважаньні правых ухілістаў, паказала ўсю памылковасьць і шкоднасьць іх тэорый аб памяншэньні тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, аб дэградацыі сельскай гаспадаркі і інш.

Першы год пяцігодкі прайшоў ня толькі пад знакам выкананьня намечаных „аптымальных" тэмпаў, але нават перавыкананьня. Вялізарны рост прадукцыі прамысловасьці БССР, уцягненьне тысяч чалавек новых рабочых у прамысловасьць, узьнятьце прадукцыйнасьці працы, рост заработнай платы, бесперапынны рост капітальных укладаньняў, увядзеньне на працягу мінулага году ў працу дзесятка новых прадпрыемстваў—усё гэта сьведчыць аб значных дасягненьнях прамысловасьці БССР. Трэба мець на ўвазе, што гэтыя дасягненьні, якія гавораць аб перавыкананьні 1-га году пяцігадовага пляну, атрыманы пры далёка ня поўным скарыстаньні ўсіх магчымасьцяў і рэзэрваў у прамысловасьці.

Такім чынам, пры ўвядзеньні беспераперыннага тыдню, пры ўсямернай мабілізацыі маючыхся рэзэрваў і рэсурсаў можна дасягнуць яшчэ больш шпаркага тэмпу разьвіцьця прамысловасьці.

Калі да гэтага дадаць яшчэ тыя магчымасьці, якія адчыняюцца перад прамысловасьцю ў сувязі з шпаркім тэмпам разгортваньня калектывізацыі ў сельскай гаспадарцы, а таксама ў сувязі з пашырэньнем вывучэньня прыродных багацьцяў БССР і прымяненьнем апошніх дасягненьняў навукі для іх скарыстаньня,—дык з усёй яскравасьцю выяўляецца неабходнасьць перагляду пяцігадовага пляну народнай гаспадаркі БССР па паасобных галінах у бок ягонапашырэньня, што і прынята СНК БССР.

Адным з галоўнейшых момантаў дапаўненьня пяцігадовага пляну зьявіцца перагляд аб'ёму новага капітальнага будаўніцтва па прамысловасьці. Неабходна будзе высунуць шэраг новых аб'ектаў капітальнага будаўніцтва па розных галінах.

Гэтак, у першую чаргу, у сувязі з цяжкасьцямі, якія перажываюцца прамысловасьцю з забясьпечаньнем палівам, у асаблівасьці данецкім, неабходна даповніць пяцігодку арганізацыяй Торфтрэсту як у бок павялічэньня здабычы торфу, гэтак і заводзкай перапрацоўкі яго. Патрэбна павялічыць колькасьць намечаных да асваеньня торфабалот, паскорыць пабудову заводаў, дабавіць новыя аб'екты па тэхнічнай перапрацоўцы торфу. Рэканструкцыя энэргетычнай базы, пуск Асінаўкі і пачатак будаўніцтва 2-й ДРЭС у Гомельскім раёне не забясьпечыць цалкам запатрабаваньняў народнай гаспадаркі ў асаблівасьці ў сувязі з калектывізацыяй. Да канца пяцігодкі неабходна будзе скончыць 2-ю ДРЭС і пачаць пабудову 3-й ДРЭС у БССР. Праблема Кабелицкіх парогаў павінна быць усебакова вывучана і практычна пастаўлена. Нарэшце, трэба будзе пашырыць будаўніцтва мясцовых электрастанцый.

Дапаўненьне новымі аб'ектамі павінна мець месца таксама і ў мэталёапрацоўчай прамысловасьці. Тут трэба намеціць наступныя напрамкі:

Пашырэньне сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва, разьвіцьцё агульнага машынабудаўніцтва, абслугоўваньне патрэб прамысловасьці і сельскай гаспадаркі ў зборцы і рамонту машын і выкананьні індывідуальных заказаў. У суадпаведнасьці з гэтым неабходна паставіць пытаньне аб пачатку пабудовы яшчэ аднаго заводу с.-г. машынабудаўніцтва, пашырыць існуючыя, даповніць пяцігодку заводамі па выпуску рухавікоў, тарфяных машын, санітарнага абсталяваньня рамонтных, зборачных майстэрняў і г. д.

Будаўніцтва ў хэмічнай прамысловасьці таксама павінна быць дабаўлена. Новыя аб'екты неабходна грунтаваць на выраб азоту (для мэтаў сельскае гаспадаркі), хэмічнай перапрацоўкі торфу і г. д.

Прамысловасьць будаўнічых матар'ялаў ня можа здаволіць цалком запатрабаваньняў на будаўнічыя матар'ялы. Намечанае па пяцігодцы рэспубліканскай прамысловасьці будаўніцтва цэгляных заводаў будзе выканана за першыя два гады ў значнай сваёй частцы—звыш 50 проц. Таму дапаўненьне пяцігадовага пляну на пабудове аб'ектаў, якія вытвараюць будаўнічыя матар'ялы, зьяўляецца рашучай неабходнасьцю. Гэта датычыцца таксама дрэваапрацоўчай і шклопрамысловасьці.

Нарэшце, пяцігодка павінна быць даповнена капітальнымі работамі, пакіраванымі на падрыхтоўку сыравіннай базы для прамысловасьці: арганізацыя „фабрык" па вытворчасьці ільно-пянька-сыравіны, бульбянай і т. п. (прамысловыя савгасы).

Гэткія асноўныя дапаўненьні, якія патрэбна будзе ўнесьці ў пяцігодку. Разам з тым неабходна будзе пераглядзець і іншыя галіны ў бок павялічэньня капітальнага будаўніцтва, у асаблівасьці па тэкстыльнай і харчавой прамысловасьці.

Вядома, што перагляд капітальнага будаўніцтва, паскораньне будаўніцтва новых аб'ектаў пацягне за сабой і дадатковы рост прадукцыі і колькасьці рабочых і паляпшаньне якасных паказчыкаў—рост прадукцыйнасьці працы і дадатковае зьніжэньне сабекошту прадукцыі.

Гэтыя задачы мы ставім на перавале да XIII году існаваньня савецкай улады,—задачы паскораных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, індустрыялізацыі краіны, калектывізацыі сельскай гаспадаркі, бязупыннага паляпшаньня становішча рабочае клясы.

Пастаўленыя задачы з усёй яскравасьцю сьведчаць аб правільнасьці кіраўніцтва камуністычнае партыі, аб вялічэзным значэньні ўцягненьня шырокіх рабочых мас у справу сацыялістычнага будаўніцтва, аб ролі сацыялістычнага спаборніцтва, высунутага рабочай масай у падтрыманьне генэральнай лініі партыі.

На парозе XIII-га году, аглядываючыся на пройдзены XII-ці гадовы этап, падагульваючы вынікі першага году пяцігодкі, мы ставім новыя складаныя задачы далейшага разьвіцьця сацыялістычнай прамысловасьці і ўсяе народнае гаспадаркі. І гэтыя задачы будуць вырашаны з тым, каб яшчэ больш шпаркім тэмпам ісьці да канчатковай пабудовы сацыялізму.

Ул. Страноўскі.

Калгаснае будаўніцтва на новым этапе.

...НЯЦЬ ЯКАСЬЦЬ КАЛ...ГНАГА БУДАЎНІЦТВА.

...ялікі час аддзяляе ад XV зьезду, ...канфэрэнцыі УсеКП(б) і XII ...у КП(б)Б, вызначыўшых канкрэт...перапрыёмствы сацыяльнай і ...чнай рэканструкцыі сельскае ...даркі на падставе по...вытворчых форм змычкі рабочае ...з батрацкім і бядняцка-серад...м сялянствам вёскі. Зараз ужо ...аем моцную шырока-раскінутую ...калгасаў і прасьцейшых вы...ых с.-г. аб'яднаньняў, нават у ...далёкіх і глухіх кутках Бела...е рэспублікі. Пад ударамі будаў...сацыялістычнага земляробства ...ецца цераспалосіца, дальняя...е, хутарская і адрубная сыстэма ...робства, застаўленая ў спадчыну ...ускай вёсцы царызмам і надмацнё...„прышчэпаўшчынай".

...нтрольныя лічбы пяцігадовага пля...будаўніцтва народнае гаспадаркі і ...туры БССР на 1928-29 г. у ад...ах калектывізацыі вёскі прады...валі калектывізаваць за першы ...яцігодкі 132 тыс. гэктараў, ці ...проц. зямлі ўсяе плошчы сельска...дарчага карыстаньня БССР. На ...е-ж кантрольныя лічбы аказаліся ...льце калгаснай рэчаістасьці. **На ...рэдніх даных на 1-X г. г. ка...ывізавана ня 132 тыс. [гэкт. ...проц.), а 336 гэктар., ці 3,6 ...усяё плошчы сельска-гаспа...ага карыстаньня.** Агульная ...асьць калгасаў на 1-X **дасягну...713, з якіх ёсьць 55 калга...з плошчай ад 500 да 1000 гэк...ў і 25 калгасаў з плошчай ад ...да 4000 гэктар., іншымі сло...кажучы, калгаснае будаў...а зараз уступае ў новы этап,** ...ебач з далейшым колькасным ...м калгасаў – **непаслабная ўва...га павінна быць зьвернута на ...якасныя паказальнікі калгаснага руху.**

Перш за ўсё пільная ўвага павінна быць зьвернута **на сацыяльны склад** уступаючых сацыяльна-эканамічных груп сялянства вёскі ў калгасы, на **іх узаемаадносіны ў саміх калгасах** і наколькі моцна ў гаспадарчай дзейнасьці кожнага калгасу закладваюцца і закладзены **даподліна сацыялістычныя тэндэнцыі і наколькі зьнішчаецца супроцьлеглая прыватна-ўласьніцкая тэндэнцыя.**

Ніколі ня трэба забываць, каб не ўпадаць у глыбокую палітычную памылку, што пры аб'яднаньні паасобных сацыяльна-эканамічных груп вёскі ў калгасы **адразу-ж наступае сацыялізм.** Ня трэба думаць, што ў калгасе адразу-ж сьцяраюцца сацыяльна-эканамічныя нежы, што спыняецца клясавая барацьба паміж паасобнымі групамі сялянства. Не, клясавая барацьба працягваецца, але яна працягваецца ў іншай форме, іншымі мотадамі, чымся на вёсцы і зусім на іншай глебе. Што гэта так, што клясавая барацьба мае месца ў калгасах, можна бачыць хаця-б з таго, што ёсьць выпадкі, хаця і адзінкавыя, калі калгасы аднаўляюцца ад партыйна-пралетарскага кіраўніцтва. Там адбываецца барацьба за кіраўніцтва калгасамі паміж папаўшымі ў калгас кулацкімі і заможнымі элемэнтамі з аднаго боку і бядняцка-серадняцкімі масамі—з другога. Больш таго, здача калгасам хлебных лішкаў прыватніку—зьява кулацкага характару і калгас, атрымліваючы ад дзяржавы налёгкі па земляўпарадкаваньні, сельска-гаспадарчаму падатку, атрымліваючы кароткатэрміновыя, доўгатэрміновыя пазыкі, сельска-гаспадарчыя машыны і г. д. і аддаючы хлебныя лішкі прыватніку—робіцца не калгасам, а кулацкім лжэкалгасам.

РАШУЧЫ АДПОР КУЛАЦКІМ ІМКНЕНЬНЯМ.

Краеугольным камнем, навакол якога зараз адбываецца клясавая барацьба ў калгасах, гэта—непадзельныя капіталы. Усялякі крок у адносінах навялічэньня непадзельных капіталаў у калгасах, г. зн. ператварэньне індывідуальных сродкаў вытворчасьці сялёў калгасаў у калектыўныя, сустракае супраціўленьне з боку кулацкіх і заможніцкіх элемэнтаў.

Пры грамадзкай апрацоўцы глебы, з наліччам сродкаў вытворчасьці ў індывідуальнай уласнасьці, атрымліваюцца прывілегіі ў сялёў калгасаў, наючых уласныя сродкі вытворчасьці над нямаючымі іх, дзякуючы чаму ўстанаўліваецца няроўнасьць у вытворчасьці і хатнім быту. Нарэшце, вынікі гаспадарчай, калектыўнай дзейнасьці разьмяркоўваюцца нераўнамерна і на долю заможніцкіх, індывідуальна эксплёатуючых сродкі вытворчасьці элемэнтаў выпадае больш, чым бядняцкай частцы. Бяз усякага сумленьня, дробна-ўласьніцкія тэндэнцыі ў калгасах маюць надта вялікае адмоўнае палітычнае значэньне, таму што яны перашкаджаюць пашырэньню непадзельных капіталаў, зьяўляючыхся моцнай базай далейшага разьвіцьця калгасаў, іх устойлівасьці і наогул дабрабыту.

СРОДКІ ВЫТВОРЧАСЬЦІ БОЛЬШ АБАГУЛЬВАЦЬ.

Непадзельныя капіталы, гэта—тая частка матар'яльных і грашовых сродкаў, якая не падлягае разьмеркаваньню паміж сялёў калгасу ні пры якіх умовах, і якія ідуць выключна на будаўніцтва калектыўнага земляробства. Непадзельныя капіталы, гэта—сацыялістычнае накапленьне, барацьба за пашырэньне якога на сучасным этапе калгаснага будаўніцтва набывае актуальнае значэньне. Сучаснае становішча ў адносінах унутрыкалгаснага накапленьня ніяк нельга прызнаць здавальняючым. З усёй масы непадзельных капіталаў толькі 12,4 проц. складаюць унутрыкалгасныя накапленьні, а астатнія 87,6 проц. падаюць на масасьць, перададзеную калгасам дзяржаваў.

У практычнай працы асобных ведамстваў, кіруючых калгасным рухам існуе **фармальны падыход у ацэнцы якасных паказальнікаў аграмаджанага сэктару, і ў прыватнасьці ў ацэнцы ступені працэсу сацыялістычнага накапленьня.** Напрыклад, Белкалгассаюз і ў сучасны момант падыходзіць да вывучэньня калгасаў не **па ступені абагульненьня** ў іх працы, сродкаў вытворчасьці і наогул элемэнтаў сельска-гаспадарчай вытворчасьці, а па іх **статутных формах.** Гэтакі падыход да вывучэньня калгасаў у корні няправільны, таму што ён замазвае сапраўдны малюнак якаснага боку калгаснага разьвіцьця. Каб ня быць галаслоўным, прыводзім наступныя даныя: пасьля вытварэньня групоўкі статутных форм калгасаў па ступені абагульненьня ў іх сродкаў вытворчасьці і пасеву аказалася, **што 15 проц. с-г. арцеляў не зьяўляюцца арцелямі, а яны толькі носяць назву арцеляў, на справе-ж гэта або т-вы па грамадзкай апрацоўцы зямлі, або нават машынныя таварыствы,** таму што ў іх абагуленая частка складае ўсяго да 30 проц., а павінна быць сродкаў вытворчасьці ад 60 да 95 проц. і пасеву ад 90 да 100 проц. Што датычыцца таварыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі, дык у 20 проц. іх зусім адсутнічаюць якія-б то-бы ні было калектыўныя элемэнты. Найвялікшаю ступеньню абагуленьня і аб'ёму непадзельных капіталаў адрозьніваюцца камуны. Адгэтуль, пры ацэнцы калгасаў і наогул сельска-гаспадарчых вытворчых аб'яднаньняў наколькі яны зьяўляюцца арганізацыямі наступова сацыялістычнага тыпу, у першую чаргу і галоўным чынам патрэбна мець на ўвазе разьмер абагуленых сродкаў вытворчасьці і ў прыватнасьці разьмер непадзельных капіталаў.

БОЛЬШ УЗБУЙНЯЦЬ КАЛГАСЫ.

З пытаньнем тэмпу абагуленьня і павялічэньня непадзельных капіталаў, як фактараў супроцьдзейнічаючых дробна-ўласьніцкім тэндэнцыям,—**зьвязана пытаньне буйнасьці калгасаў.** Толькі буйныя калгасы, шляхам прамысловых прадпрыёмстваў (індустрыялізацыі) па пераапрацоўцы сельска-гаспадарчых прадуктаў, выключаюць з індывідуальнага звароту сродкі вытворчасьці. І ў будаўніцтве калгасаў «прышчэпаўшчына» дае сябе адчуваць таксама, як і ў індывідуальным сэктары сельскае гаспадаркі.

Земляўпарадкаваньне ня толькі ня было пастаўлена на службу калектывізацыі, а наадварот—садзейнічала разбурэньню існуючых калгасаў і скарачэньню іх зямельнай плошчы. Тут неабходна прывесьці гістарычную даведку, у якіх умовах разьвівалася калектывізацыя ў БССР у мінулыя гады і якое становішча мы ў сучасны момант маем у выніку скажэньня палітыкі партыі ў працы па земляўпарадкаваньні і ў прыватнасьці калектывізацыі. З пачатку 1920 году і амаль што да вясны 1928 году будаўніцтва калгасаў адбывалася на землях дзяржаўнага, зямельнага маёмаснага фонду (б. абшарніцкіх землях). З агульнай колькасьці калгасаў **80,6 проц. (на 1-VI-1928 г.) прыпадае на калгасы, арганізаваныя на дзяржаўным зямельным фондзе і толькі 19,4 проц. на землях працоўнага карыстаньня.** Прычым, б. абшарніцкія маёнткі, дзякуючы паркамзямаўскім апякунам індывідуальных формаў землякарыстаньня, земляўпарадкаваліся па хутары, адрубы і насёлкі, а па застаўшыхся сядзібах з будынкамі, садамі і буйным інвэнтаром (што не паддавалася індывідуальнаму карыстаньню) утварыліся карлікавыя калгасы, якія больш можна назваць хутарамі, чым калгасамі. Атрымоўвалася і на справе тое, што і думалі права-апартуністычныя палітыкі Наркамзему, якія выбралі лёзунгам у сваёй працы „праз хутар і адруб—да сацыялізму".

У выніку кулацкай практыкі ў будаўніцтве калгасаў на 1-VI-1928 году ў складзе 611 калгасаў **мелася 55,6 проц. зямельнай плошчы ад 20 і менш гэктараў і да 100 гэктар.** Наогул жа 25-27 гады былі крытычным пэрыядам у будаўніцтве калгасаў, які характарызуецца ня толькі застоем у колькасным і якасным росьце калгасаў, але нават і распадам існуючых калгасаў.

Што-ж нарэшце атрымалася? Атрымалася тое, што 75-80 проц. калгасаў былі **пазбаўлены магчымасьці ўжываньня на сваіх невялікіх зямельных вучастках складаных сельска-гаспадарчых, апрацовачных і ўборачных машын** як па тэхнічных меркаваньнях, а таксама эканамічн

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ПАРАДАК ЗАЦЬВЕРДЖАНЬНЯ НАРМАЛЬНЫХ СТАТУТАЎ ЖЫЛІШЧНЫХ КААПЭРАТЫВАЎ УСІХ ВІДАЎ І АКРУГОВЫХ САЮЗАЎ ЖЫЛІШЧНАЙ КААПЭРАЦЫІ.

На падставе арт. 39 пастановы ЦВК і СНК СССР „Пра жыліщную каапэрацыю" (З. З. СССР 1924 г., № 5, арт. 60) Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць устанавіць наступны парадак зацьверджаньня нармальных статутаў жыліщных каапэратываў усіх відаў і акруговых саюзаў жыліщнай каапэрацыі:

Нармальныя статуты жыліщных каапэратываў усіх відаў і акруговых саюзаў жыліщнай каапэрацыі зацьвярджаюцца Народным Камісарыятам Унутраных Спраў пасьля ўзгадненьня з Народным Камісарыятам Юстыцыі і Народным Камісарыятам Працы.

СТАРШЫНЯ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР
А. Чарвякоў.

НАМ. СТАРШЫНІ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР
М. Карклін.

САКРАТАР ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР
А. Хацкевіч.

27 кастрычніка 1929 г.
г. Менск.

Постановление Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

О ПОРЯДКЕ УТВЕРЖДЕНИЯ НОРМАЛЬНЫХ УСТАВОВ ЖИЛИЩНЫХ КООПЕРАТИВОВ ВСЕХ ВИДОВ И ОКРУЖНЫХ СОЮЗОВ ЖИЛИЩНОЙ КООПЕРАЦИИ.

На основании ст. 39 постановления ЦИК и СНК СССР „О жилищной кооперации" (С. З. СССР 1924 г. № 5, ст. 60) Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют установить следующий порядок утверждения нормальных уставов жилищных кооперативов всех видов и окружных союзов жилищной кооперации:

Нормальные уставы жилищных кооперативов всех видов и окружных союзов жилищной кооперации утверждаются Народным Комиссариатом Внутренних Дел по согласованию с Народным Комиссариатом Юстиции и Народным Комиссариатом Труда.

ПРЕДСЕДАТЕЛЬ ЦЕНТРАЛЬНОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА БССР
А. Червяков.

ЗАМ. ПРЕДСЕДАТЕЛЯ СОВЕТА НАРОДНЫХ КОМИССАРОВ БССР
М. Карклин.

СЕКРЕТАРЬ ЦЕНТРАЛЬНОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА БССР
А. Хацкевич.

27 октября 1929 г.
г. Минск.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

пра мерапрыёмствы для больш шырокага ўцягненьня ў сельска-гаспадарчую эксплёатацыю мэліараваных зямель у БССР і пра павялічэньне ўкладаньняў сродкаў насельніцтва ў мэліарацыйнае будаўніцтва.

Для больш шырокага ўцягненьня ў сельска-гаспадарчую эксплёатацыю забалочаных і няўжытковых зямель у БССР, стварэньня спрыяючых умоў для пашырэньня сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі, унясеньня большай выразнасьці ў арганізацыю работы і абслугоўваньне мэліарацыйных і тарфяных таварыстваў, а таксама для павялічэньня ўкладаньняў сродкаў насельніцтва ў мэліарацыйнае будаўніцтва, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Праводзіць і надалей жорстка канцэнтрацыю мэліарацыйных і калёнізацыйных работ па басэйнах рэк і буйных магістральных канавах, забясьпечваючы, аднак, разам з тым і поўнае садзейнічаньне насельніцтву ў яго работах на вучастках, якія адведзены ад буйных балотных масываў.

2. Выбіраць аб'екты работ і колькасьць іх трэба з такім разьлікам, каб у найбольш кароткі тэрмін магчыма было цалкам асвоіць балота і забалочаныя плошчы, што знаходзяцца ў басэйнах рэгулюемай ракі; тэрмін гэты павінен быць ад 2 да 5 год у залежнасьці ад аб'ектаў.

3. Праекты работ і пляны скарыстаньня асушаных плошчаў павінны складацца на падставе дэталёвых поўных вышуканьняў і павінны максымальна забясьпечваць разьвіцьцё сельскай гаспадаркі, прамысловасьці, рыбнае і лясное гаспадаркі, прычым мэліарацыя данага раёну, калі яна ўносіць значныя зьмены ў гаспадарку раёну, павінна быць пастаўлена ў аснову рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ўсяго раёну і з ёй павінны быць узгоднены ўсе мерапрыёмствы сельскай гаспадаркі, як земляўпарадкаваньне, індустрыялізацыя, аграабслугоўваньне і інш.

Пры складаньні праэктаў і плянаў скарыстаньня асушаных плошчаў кіравацца найвялікшай эфэктыўнасьцю іх для ўсяе гаспадаркі раёну.

Пры скарыстаньні вылучаемых для сельска-гаспадарчай эксплёатацыі пізінных і пераходных балот імкнуцца як на інтэнсыўнае асушэньне, гэтак і закультываньне іх.

4. У зьвязку з перадачай Белкалгассаюзу мэліарацыйных таварыстваў, перадаць яму наступныя мэліарацыйныя работы, што праводзяцца зараз Народным Камісарыятам Земляробства і яго мясцовымі органамі:

а) правядзеньне дробнай асушальнай сеткі па балотах мэліарацыйных таварыстваў з усімі гідратэхнічнымі пабудовамі на іх па праэктах, складзеных зямельнымі органамі і зацьверджаных у адведным парадку;

б) вышуканьні і складаньне праэктаў і вытворчых плянаў па гідратэхніцы на дробных балотных масывах, што знаходзяцца ў працоўным карыстаньні мэліарацыйных таварыстваў. Разьмеры такіх масываў устанаўляюцца Народным Камісарыятам Земляробства, які ўзгадняе гэта з Белкалгассаюзам;

в) складаньне арганізацыйных і апэрацыйных плянаў па культуртэхніцы і выкананьне культурна-тэхнічнае працы па гэтых плянах;

г) правядзеньне паказальных мерапрыёмстваў па культуры балот, палепшаньню сенажацяй і выганаў у мэліарацыйных і іншых аб'яднаньнях.

5. Для зьнішчэньня паралелізму ў работах мэліарацыйных і тарфяных таварыстваў па асваеньні асушаных плошчаў, надаць права мэліарацыйным таварыствам займацца здабываньнем торфу на апал і ўгнаеньне, а тарфяным таварыствам—займацца мэліарацыяй культуры і культурай балот.

Для лепшага абслугоўваньня тарфяных таварыстваў перавесьці іх з моманту выданьня гэтай пастановы на статут мэліарацыйных таварыстваў і перадаць пад кіраўніцтва Белкалгассаюзу.

Тыя тарфяныя таварыствы, якія галоўнай сваёй мэтай ставяць здабываньне торфу на продаж, абслугоўваюцца Белсампрамсаюзам.

6. З работ па торфу, што зараз выконваюцца Народным Камісарыятам Земляробства і яго мясцовымі органамі, перадаць Белкалгассаюзу:

а) абслугоўваньне каапэраванага насельніцтва, якое займаецца торфаздабываньнем і торфаскарыстаньнем (досьледы, складаньне праэктаў, плянаў і інш);

б) паказальныя мерапрыемствы, прапаганду ўжываньня торфу ў сельскіх мясцовасьцях.

7. Перадаць пад загад Белкалгассаюзу і перадаваць у будучым патрэбныя для выкананьня згодна адведзенага зацьверджаных плянаў і каштарысаў паказаных работ, апэрацыйна-тэхнічны пэрсанал, інвэнтар (мэханічныя рухавікі, тарпяны, луга-балотны), а таксам зваротныя крэдыты на выкананьне асушальных і іншых работ і на забясьпечаньне таварыстваў угнаеньнем, насеньнем, інвэнтаром, якое ідзе праз сыстэму сельска-гаспадарчай каапэрацыі.

Утрыманьне памянёнага пэрсаналу аднесьці на каштарыс НК Земляробства на мэліарацыю і торф.

8. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства разам з Белкалгассаюзам распрацаваць на працягу месяца новы статут мэліарацыйнага таварыства і падаць на зацьверджаньне Эканамічнай Нарады БССР.

9. Для забясьпечаньня таварыствамі калектыўнай асушкі і эксплёатацыі асушаных балот, а таксама пераходу іх у вышэйшыя віды калгасаў, даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства разам з Белкалгассаюзам перад пачаткам работ таварыства праводзіць земляўпарадкаваньне ўсяе зямельнае плошчы, якую эксплёатуе таварыства, вылучаючы таварыства, як паасобную гаспадарчую адзінку. Асушаныя плошчы лічыць землямі калектыўнага карыстаньня таварыства, не дапушчаючы падзелу іх на вучасткі для паасобных членаў таварыства.

10. Адзначаючы, што трактарнае ўзворваньне цаліны балот і далейшая апрацоўка яго таней за конную (ужо атрымала шырокае ўжываньне як на дзяржаўных работах, гэтак і на работах насельніцтва) і зьяўляецца магутным фактарам пашырэньня і ўзмацненьня калектыўных форм гаспадаркі ў мэліарацыйных таварыствах, што лік занятых зараз працай на балоце трактараў пакрывае толькі нязначную частку сапраўднай патрэбы ў іх, прызнаць неабходным для забясьпечаньня арганізацыі мэханічнай апрацоўкі балотнай глебы і выкананьня пяцігадовага пляну па культуры балот узяць напрамак на шырокую мэханізацыю і электрафікацыю буйных гідратэхнічных і культур-тэхнічных работ праз ужываньне землячарпальных машын, трактараў, глебафрэзаў і інш.

11. Для забясьпечаньня найбольш шпаркага і шырокага разьвіцьця мэліарацыйнага будаўніцтва насельніцтвам і яшчэ большага ўцягненьня ў яго сродкаў і працы насельніцтва, даручыць:

а) Белкалгассаюзу распрацаваць пытаньне пра ўнутраны распарадак працы мэліарацыйных таварыстваў, які-б забясьпечваў максымальнае скарыстаньне вольнага часу насельніцтва ў мэліарацыйным будаўніцтве, а таксама пра стварэньне непадзельных капіталаў у таварыствах;

б) Народнаму Камісарыяту Земляробства з прыцягненьнем Белкалгассаюзу—распрацаваць пытаньне пра парадак свачаснага і поўнага забясьпечваньня тэхнічным і каапэрацыйна-арганізацыйным абслугоўваньнем і сродкамі вытворчасьці мэліарацыйных работ насельніцтва;

в) Навукова-Дасьледчаму Інстытуту імя Леніна—распрацаваць пытаньне пра мэліарацыйнае раёнаваньне БССР і ўстанаўленьне гранічных затрат на гэктар плошчы па розных відах мэліарацыі;

г) Народнаму Камісарыяту Земляробства з прыцягненьнем Белкалгассаюзу, Народнага Камісарыяту Фінансаў і Беларускага Сельска-гаспадарчага Банку—распрацаваць пытаньне пра віды работ, якія ўтвараюцца насельніцтвам за ўласны кошт і за кошт крэдытаў і ў зьвязку з гэтым перагледзіць сярэдні процант крэдытаваньня насельніцтва, а таксама і разьмеры далявых удзелаў у мэліарацыйным будаўніцтве.

12. Для пашырэньня мэханізацыі і садзейнічаньня росту тэмпу мэліарайных работ запрапанаваць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі пачаць з 1929-30 г. выраб найбольш простых машын (балотных плугоў, каткоў, барон і інш.).

Што тычыцца да больш складаных машын (землячарпалак, гусенічных трактароў), то Народнаму Камісарыяту Земляробства належыць, на падставе беларускай практыкі, вызначыць патрэбны тып землячарпалак і трактараў і паставіць перад саюзнымі органамі пытаньне пра выраб гэтых машын на заводах СССР.

Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства і Белкалгассаюзу ўстанавіць намэнклатуру найбольш простых машын, патрэбных для мэліарацыі і зрабіць з Вышэйшым Саветам Народнай Гаспадаркі БССР адпаведную ўмову на выраб іх.

13. Увесьці з бягучага году прэміраваньне працаўнікоў па мэліарацыі і торпу за колькасьць і якасьць выкананае работы. Практыкаваць больш шырэй камандыроўкі за межы БССР з апарату Народнага Камісарыяту Земляробства, Калгассаюзу і мясцовых працаўнікоў—спэцыялістых для падвышэньня і кваліфікацыі, а для кансультацыі па найбольш важных пытаньнях запрашаць замежных спэцыялістых.

14. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства скончыць у 1929-30 годзе прапрацоўку матар'ялаў для складаньня генэральнага пляну мэліарацыі.

15. Адзначаючы, што дасягненьні мэліарацыйнага будаўніцтва ў БССР мала вядомы шырокай грамадзкасьці як у межах у БССР, гэтак і па-за яе межамі (калёнізацыя балот, работы таварыстваў і інш.), запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства, Навукова-Дасьледчаму Інстытуту імя Леніна і Беларускаму Дзяржаўнаму Выдавецтву выдаваць адпаведную навуковую і папулярную літаратуру аб мэліарацыйным будаўніцтве ў БССР, шырока высьвятляць гэтую працу ў пэрыядычным друку, практыкаваць экскурсіі сялян на буйныя мэліарацыйныя работы і гаспадаркі на балотах (Мар'іна і інш)., а таксама практыкаваць кіно-здымкі як дзяржаўных работ, гэтак і работ насельніцтва.

16. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя пасьля ўзгадненьня з Народным Камісарыятам Земляробства распрацаваць і выдаць інструкцыю пра медыка-санітарныя мерапрыемствы ў зьвязку з разгортваньнем мэліарацыйных работ.

НАМ. СТАРШЫНІ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР
М. Карклін.

НАМ. КІРАЎНІКА СПРАЎ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ І ЭКАНАМІЧНАЙ НАРАДЫ БССР
Л. Дубавіцкі.

22 кастрычніка 1929 г., г. Менск.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ВЫЗВАЛЕНЬНЕ ТАВАРЫСТВА ДАПАМОГІ РАЗЬВІЦЬЦЮ АЎТАМАБІЛІЗМУ І ПАЛЕПШАНЬНЮ ДАРОГ У БССР (АЎТАДОР) АД СУДОВАГА ЗБОРУ.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

Вызваліць Таварыства дапамогі разьвіцьцю аўтамабілізму і палепшаньню дарог у БССР „АЎТАДОР" і яго мясцовыя арганізацыі ад судовага збору і іншых выдаткаў па судовых справах.

СТАРШЫНЯ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР
М. Галадзед.

НАМ. КІРАЎНІКА СПРАЎ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ І ЭКАНАМІЧНАЙ НАРАДЫ БССР
Л. Дубавіцкі.

31 кастрычніка 1929 г., г. Менск.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ЗЬМЕНУ ПАСТАНОВЫ СНК БССР „АБ АПЛАЦЕ ПАМЯШКАНЬНЯЎ, ЗАНЯТЫХ У МУНІЦЫПАЛІЗАВАНЫХ ДАМОХ. А ТАКСАМА Ў ДАМОХ, ЯКІЯ ПАДПАРАДКАВАНЫ ЖЫЛІШЧНЫМ ТАВАРЫСТВАМ".

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе: зрабіць у пастанове Савету Народных Камісараў БССР за 4 ліпеня 1927 г. „Аб аплаце памяшканьняў, занятых у муніцыпалізаваных дамох, а таксама ў дамох, якія падпарадкаваны жыліщным таварыствам" (З. З. БССР 1927 г., № 34, арт. 178) наступныя зьмены:

1. Дадаць да арт. 1 п. „в¹" у наступцай рэдакцыі:

„в¹) прыватныя лячэбніцы, лябараторыі і іншыя мэдычныя ўстановы аплачваюць занятыя імі памяшканьні па стаўках, якія ўстанаўляюцца мясцовымі выканаўчымі камітэтамі, але ня больш ставак, паказаных у п. „в" гэтага артыкулу".

2. Арт. 7 з увагаю і 8 скасаваць.

СТАРШЫНЯ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР
М. Галадзед.

НАМ. КІРАЎНІКА СПРАЎ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ І ЭКАНАМІЧНАЙ НАРАДЫ БССР
Л. Дубавіцкі.

31 кастрычніка 1929 г., г. Менск.

КУЛЬТУРНЫ АСЯРОДАК.

(Савгас Раванічы, Менскай акр.).

Да Кастрычнікавай рэвалюцыі маёнтак Раванічы зьяўляўся месцам адначынку паноў Слатвінскіх ад падарожжа па розных заграніцах. Гэтыя кволыя паны не пераносілі вільготнага беларускага клімату. Сонечная Ніца вабіла іх далікатныя панскія пачуцьці.

Праўда, дзеля гэтага патрэбны былі шалёныя грошы, але паноў мала абыходзіла такая дробязь: у іх былі дзесяткі маёнткаў, дзесяткі тысяч гэкт. лепшай пахаці, сотні броварах, крахмальняў, млыноў.

Дзеля таго, каб весела бавіцца ў Ніцы, ці праводзіць сьвецкія сэзоны ў Парыжы, патрэбны былі грошы і грошы. Але ці ёсьць аб чым турбавацца?

Дзеля гэтага існавала цэлая сыстэма, каб крывавы мужыцкі пот пераганяць у залатую чырвань звонкіх дзесятак і пяцёрак. Дзеля гэтага верныя падпанкі: упраўляючыя, аканомы і намесьнікі сталі крукам над сьпінамі панурых парабкоў, адданыя лясьнікі, турбуючыся аб панскіх лясных багацьцях—дралі з жывога і мёртвага за ягады, грыбы.

Селяніну ня было выхаду, гусюды ціснула яго магутная рука пана і ў полі і ў лесе і дома. Усе баяліся ня толькі пана, але нават падпанкаў, пачынаючы ад упраўляючага і канчаючы намесьнікам.

А калі ня хочаш атрымоўваць у месяц нэндзнай ардынары: па 3 пуд. мукі, 5 ф. солі, паўпуда круп і гатоўкі 3 руб.—каціся з сям'ёй на ўсе чатыры бакі. А куды пойдзе безьзямельны парабак, без свайго кута? Няма выхаду забітаму, запакутаванаму мужыку, ніхто не абароніць яго ад жорсткай эксплёатацыі паноў-павукоў.

Як грукат грому сярод белага дня ляснула неспадзеўкі Кастрычнікавая рэвалюцыя. Спрадвечны парабак выпрастаў сваю сьпіну, беларускі рабочы і селянін не пашанавалі „далікатных" паноў і выгналі іх з маёнтку.

Нямецкая і польскія акупацыя ізноў вярнулі паноў у маёнтак, ізноў імкнуліся паны сагнуць выпрастаную сьпіну парабка і селяніна. Але ня доўга прышлося ім панаваць.

У 1920 г. працоўныя ўсяго Савецкага Саюзу магутным напорам выкінулі паноў і фабрыкантаў з Савецкай Беларусі. Як памялом вымятаюць печ, так вымелі з нашай краіны розную панскую нечысьць. Але адступаючы паны забралі з маёнтку ўсё да званьня. Багатая гаспадарка абярнулася ў руіну, у месца запустаду. Ня было ніводнага каня, ніводнай каровы, ніводнай с.-г. машыны. Голымі рукамі пачаў сваю працу савгас Раванічы. З вялікімі цяжкасьцямі здабываліся першыя коні, дробненькія сялянскія кароўкі...

Але гэта было ў мінулым. Зараз савгас стаў ізноў багатым, як і даўней, але калі пры панах сялянства з асьцярогаю падыходзіла да маёнтку, дык зараз савгас прыцягвае да сябе ўсіх працоўных.

У палацах, дзе раней забаўляліся падвыпіўшыя паны, зараз працуе 7-мі годка, якая змагаецца з цемрай і адсталасьцю. У б. штабе бізьлітаснага прыгону і эксплёатацыі запанавала навука, якая вучыць сялянскіх і батрацкіх дзяцей, як вясьці барацьбу з прыгонам і эксплёатацыяй ва ўсім сьвеце.

Замест драпежнай эксплёатацыі ваколічных сялян і парабкаў савгас Раванічы дапамагае беднаце ўсёяцца, дапамагае ня толькі матар'яламі, але і рознымі парадамі.

Там, дзе даўней бушавала бязмежная эксплёатацыя, зараз панує культурны асяродак.

Гэта зрабіла Кастрычнікавая рэвалюцыя.

ХРОНІКА

На шляхох палепшаньня працы.

(Цэнтр. склад Белдзяржбуду).

Вытворчая нарада цэнтраскладу Белдзяржбуду абгаварыла пытаньне аб палепшаньні якасьці культурна-масавай вытворчай работы. Для таго, каб палепшыць гэтыя выгляды работы, патрэбна правесьці належную рацыяналізацыю працэсаў вытворчасьці. З гэтай мэтай на працягу трох месяцаў павінны быць мэханізаваны сталярны і сьлясарны цэхі шляхам устаноўкі фрэзэрнага, даўбяльнага, шыпарэзнага і сьвярдзільнага ставкоў.

Гэтыя мерапрыёмствы, у мэтах узьдыму вытворчасьці і палепшаньня якасьці прадукцыі, павінны быць ажыцьцёўлены абавязкова. Гэта дапаможа паскорыць працэсы вытворчасьці, правесьці разьмеркаваньне працы і дасьць магчымасьць палепшыць матар'яльнае становішча рабочых.

Паколькі над вытворчасьць будзе надведзена тэхнічная база, так справа з настаноўкай культасьветна-масавай работы зможа пасунуцца наперад. У сувязі з гэтым адчуваецца вялікая патрэба ў пабудове клюбу-сталовай, на што маюцца і неабходныя сродкі.

Адміністрацыя Белдзяржбуду гэтыя мерапрыёмствы павінна ажыцьцявіць, бо яны зьяўляюцца жыцьцёвымі і магчымымі.

А. Бэйлін.

Рабунак сярод белага дню.

Канкурэнцыя паміж загатоўцамі настолькі яшчэ моцная, што часам даводзіць літаральна да злачынства;

Працаўнік Пранойскага пункту Дзяржгандальбелу (Магілеўская акруга) тав. Бельскі і перакупнік Хэйфец загатовілі ў сваім раёне каля пяці пудоў грыбоў (грыбы наогул з-за адсутнасьці ўраджаю туга загатаўліваюцца).

Але... праяжджаючы міма вёскі Беразкі, Краснапольскага раёну, былі раптам на дарозе затрыманы членам праўленьня Краснапольскага спажывецкага таварыства Савельевым, які сумесна з сэкратаром Бярэзскага сельсавету напалі на адзначаных працаўнікоў і патрабавалі здачы ім грыбоў.

Калі Бельскі і Хэйфец паказалі рабаўнікам свае дакуманты, што яны працаўнікі Дзяржгандальбелу, што яны выконваюць дырэктывы свайго праўленьня па загатоўцы грыбоў для экспарту, каапэратар Савельлеў і сэкратар сельсавету пачалі лаяцца матам, выцягнулі зброю і застрашалі, што ў выпадку безадкладнай здачы ім грыбоў яны ўжывуць належныя меры...

Спалоханыя на сьмерць Бельскі і Хэйфец зараз-жа адалі грыбы.

— Але гэтага мала,—крычалі хуліганы-загатоўцы,—вагу давай сюды, мы вам пакажам, як весьці загатоўку для „чужаземных" купцоў!..—і працаўнікі Дзяржгандальбелу таксама не спрачаючыся аддалі вагу.

Пракуратуры неабходна безадкладна прыцягнуць да суровай адказнасьці гэткіх хуліганаў-загатоўцаў ня толькі за лаянку і зьдзекі, але за зрыў загатоўкі грыбоў, за грубае парушэньне самых элемэнтарных правіл рэгулюючых органаў.

Трэба раз і наўсёды ўтварыць такія ўмовы на месцы, каб нейкія прайдзісьветы накшталт Савельлева ня зрывалі нашых загатовак. Трэба ў корані вырваць гэту шалёную канкурэнцыю, якая да гэтага часу наглядаецца ў шмат якіх раёнах БССР.

А. Маніч.

Паказальны працэс.

СТРЭЛЫ ЧЭРВІНСКАГА.

У ліпені месяцы г. г. пры шырокім удзеле працоўнага сялянства і вясковай актыўнай беднаты была вытварана генэральная чыстка Чэрвенскай райённай партарганізацыі.

Шмат партыйнаў-камуністаў прайшло праз строгі кантрольны фільтр чысткі.

Разаблачоны кулацкі агэнт, хабарнік, які пралез у партыю і савецкі апарат Чэрвенскага РВК Алесь Чэрвінскі з шэрагаў партыі быў выключаны.

Акалічнасьці справы паводле матар'ялаў папярэдняга сьледзтва наступныя:

У мінулым Алесь Чэрвінскі заможнік—шкурнік, які прымазаўся да партыі, каб скарыстаць сваё палажэньне і шкодзіць партыі.

Будучы ў 1926 годзе аб'езчыкам Рэвяніцкага лясьніцтва і старшынёй рабачкому ён на працягу 2 год займаўся злоўжываньнямі.

Умоўіўшыся з кулаком Дубоўскім на падчыстку дзялянкі за 112 р., ён сфабрыкаваў фіктыўны акт выкананьня гэтай працы, а атрыманыя ад лясьніцтва 112 р. нібы за падчыстку падзяліў з Дубоўскім.

Калі лясьнік Кавецкі быў зволены з пасады за нядбайнасьць, дык пры дапамозе Чэрвінскага як старшыні рабачкому яго аднавілі на пасаду і Кавецкі атрымаў 440 р. за прагул. Чэрвінскі шляхам вымагацельства атрымаў ад Кавецкага хабар 100 р.

Хутка пасьля гэтага Чэрвінскі пазнаёміўся з кулаком Мірко, у карыстаньні якога было 30 дзесяцін зямлі, жаніўся на яго дачцэ, а затым разам з цесьцем сталі красьці дзяржаўны лес, з якога Мірко пабудаваў 4 дамы па некалькі пакояў.

У 1929 годзе Чэрвінскі пралязае ў Чэрвенскі РВК і займае пасаду старшыні райённага камітэту сялянскае ўзаемадапамогі.

У часе чысткі Чэрвінскага разаблачылі сяляне Варабей і Кавецкі як хабарніка, гандляра і кулацкага агэнта.

Чэрвінскі з партыі быў выключаны і з пасады старшыні КСУ зьняты.

-- Пляваць мне ца партыю, я толькі баюся судовай адказнасьці, заявіў Чэрвінскі.

21 ліпеня ў вёсцы Рэвянічах—Чэрвінскі ўзброіўшыся рэвальвэрам пачаў сачыць за Вараб'ёвым і Кавецкім з мэтай помсты за разаблачэньні.

Прыкмеціўшы, што Кавецкі пашоў у каапэрацыйную краму, Чэрвінскі пасьледаваў за Кавецкім і стрэлам забіў Кавецкага і сялянку Сасункевіч, якая была ў краме.

У гэты-ж дзень забойства на агульным сходзе Чэрвенскай партарганізацыі з удзелам чырвонаармейцаў і сялян у ліку 900 асоб была вынесена пастанова прасіць аб жорсткім пакараньні бандыта Чэрвінскага.

Пралетарскі суд сёньня ў выязднай Сэсіі Менскага акруговага суду ў г. Чэрвені пачынае разглядаць справу Чэрвінскага і скажа сваё слова ў прыгавары.

Працэс па справе Чэрвінскага павінна ведаць сялянства Чэрвеншчыны і ўся грамадзкасьць.

Д. Кастроў.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК

на 12-ае лістапада 1929 г.

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	5.00,5	—
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	128.75	130.95
Выйгр. пазыка 1929 г.	101.05	101.45
10 проц. выйгр. паз. 27 г.	25.60	25.70
3-я сялянск. выйгр. паз. 27 г	5.05	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.45	10.80
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25.51,5	25.61,5
2 „ „ „ проц.	25.55	25.6 5
12 „ „ „ 6-проц.	25.55	25.65
1 проц. дз. паз. 1928 г.	102.23	102,28
12 пр. рэнтн. паз. 1927 г.	105,37	—

Камсамольскія суботнікі.

У дні Кастрычнікавых сьвят камсамольскімі ячэйкамі Менску былі праведзены масавыя суботнікі па разгрузцы бульбы, яблык і г. д.

У суботніках удзельнічала каля 1000 камсамольцаў і рабочай моладзі.

Хто вінават у непадрыхтоўцы да навучальнага году.

На апошнім пасяджэньні калегіі Наркамсьветы было абгавораца пытаньне аб забясьпечаньні школ падручнікамі.

Калегія канстатавала, што большасьць падручнікаў своечасова ня выйшла з друку, шмат падручнікаў і дагэтуль знаходзяцца ў друку. Затрымка ў выданьні падручнікаў была на віне Белдзяржвыдавецтва, аўтараў, Галоўліту, Мэтадкому, друкарні і адпаведных інспэктароў НКА.

У зьвязку з заявай загадчыка БДВ, што большасьць акруговых інспэктароў нарасьветы несваечасова далі заяўкі на падручнікі для школ і тым самым сарвалі своечасовае забясьпечаньне апошніх падручнікамі, калегія Наркамасьветы пастанавіла давесьці аб гэтым да ведама адпаведных акрвыканкомаў і РСІ і прасіць прыцягнуць вінаватых да адказнасьці

Побач з гэтым пастаноўлена, каб рэкамэндацыйныя сьпісы НКА для школ II канцэнтру даваў да 1 студзеня, а для II канцэнтру—не пазьней 1 лютага. Белдзяржвыдавецтву даручана скласьці фонд прэміраваньня аўтараў за своечасовую здачу падручнікаў.

Сярод фота-аматараў.

У Менску зараз налічваецца звыш 30 фотаматарскіх гурткоў пры рабочых клюбах, якімі ахоплена каля 300 чал.

Пры ЦСПСБ арганізован фота-гурток, дзе адчынена кансультацыя для аматараў па розных пытаньнях фота-тэхнікі.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кнігі і часопісі.

1. „Беларуская мэдычная думка" № 5—6. Стар. 203. Выданьне Народнага Камісарыяту Аховы Здароўя БССР.

2. „Шляхі калектывізацыі" № 4. Стар. 48, цана 20 кап. Выданьне Наркамзему, Белкалгассаюзу і Белсельсаюзу БССР.

3. „Лыскаў дзень". В. Эмануэль. Пераклад з расійскай мовы. Стар. 34, цана 35 кап. (Дзіцячая кніжка).

4. „Кастрычнік у хаце - чытальні" Д. Хайтун. Стар. 156, цана 60 кап. Выданьне Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва. Менск.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ.

АД ЦКК КП(б)Б

— У надзелю 17-га гэтага ліст... 6 з пал. гадз. увечары адбудзе... веданьне парткомкіі ЦКК К... (Менск, Савецкая 55, 3-ці паверх... № 18), дзе будуць разглядацца... наступных таварышоў:

1. Мірасава Ю. Ш. Віцебскай а...
2. Краско А. А. „
3. Сучкова З. Т. „
4. Воўкава М. П. „
5. Кліменка Івана Карпавіча — арг.

Паказаныя вышэй таварышы зьявіцца на вызначаны час. Пр... свой кошт.

Сэкратар ПК ЦКК КП(б)Бел. Л...

— У сераду, 13 лістапада, а 1... дню пры АПАД ЦК КП(б)Б скліка... рада па пытаньню дырэктывы ЦК... аб кіруючых кадрах органаў... сьветы.

Прапануецца зьявіцца выступі... Платун, Некрашэвіч, Слонім, Мазу... раў, Панкевіч, Лысоў, Рычкоў, Ц... Гурэвіч (РК КП(б)Б), Конюхаў (Ма... Аборгі абодвых Гар. Райкомаў... Сакратары і Аборгі вячэйкі КП(б)... швэю, завода „Бальшавік" і заво... мунар", Клімковіч, Балтынь, Баг... гадчык Мен Акр. АНА Заг. Па... там Акр. АНА, Шыпіла, сакратар... БДВ, Саевіч, Аўр'е, Карануўскі, Усьненоні, Канаплін, Башкевіч, Ігнатоўскі, Балуга, Мінуліч (Д... інстытут імя Леніна), Вечар, Бонд... тасена, Масевіч, Наўмёнак, ... Александровіч Ашаровіч.

АПАД ЦК К...

„На 15-е лістапада а 10 й гадзі... цы скліканцца акруговая канф... груп бедноты Менскай акругі з... най дню:

1. Аб пяцігадовым пляне ра... народнае гаспадарці Саюзу і БССР... ірэтным вызначэньнем задач для... вых арганізацый і ўстаноў.

2. Аб удзеле беднаты ў перас... сельскіх саветаў і камітэтаў с... т-заў Узаемадапамогі.

3. Выкіні работы па рэкан... сельскае гаспадарці і далейшыя за...

Канфэрэнцыя будзе праходзіць... машынаны Акрвыканкому (заля... джаньняў).

Усім прыбываючым дэлегатам п... на зварочацца ў агульную канц... АВК.

МЕНАКРУГКОМ

— 20-га лістапада скліканцца... ныя курсы сэкратароў савгасных... гаскіх вячэек КП(б)Б у гор. Ба... Усім РК КПБ неабходна своечасо... вясьціць і камандыраваць вылучан... муністых згодна раней дадзены... заньняў. Прыбываючым таварыш... курсы зварачаецца ў АВА Барысо... РК КП(б)Б.

МЕНАКРУГКОМ КП...

— Вачэрні Камуністычны Уні... Беларусі паведамляе ўсіх студэнта... маючыхся ў ВКУ, што заняткі на... курсах адбудуцца ў наступныя дн... 3, 4, 5, 8, 9, 13, 14, 15, 17, 18, 19, ... 25, 28, 29.

—Працягваецца прыём заяў на... турна - Лінгвістычнае, Сацыяльна - ... рычнае і Педалёга-Педагагічнае ад... вочнага Педфаку пры Педфаку БД... Заявы прымаюцца ў Дакладнае Пе... (Менск. Замкаровіч зая.).

Пры заявах павінны прыкладацц... кумэнт аб асьвеце мейцы працы і... гагічным стажу.

Навучаньне бясплатна.

БЮРО ЗАВОЧНАГА ПЭДФ...

— 13 лютага а 8 гадзіне увечары... машканьні Дому асьветы, ЦП саюз... наецца агульны сход асьветнікаў... з наступным абвестнай дню: „Выкіні... рэлігійнай кампаніі".

— 12 лістапада, а 3 гадзіне дню ў... каньні саюзу працасьветы склікае... рада сэкратароў групкомаў і мяст... саюзу працасьветы гор. Менску... ўсіх вышэйпамянёных абавязкова...

ПЭДГАБІНЭТ.

1. Конфэрэнцыя выкладчыкаў ф... школ г. Менску адбудзецца ў а... 12-га лістапада ў 10 гадз. раніцы.

2. Конфэрэнцыя настаўнікаў і... сераду 13-XI у 10 гадз. раніцы.

3. Конфэрэнцыя настаўнікаў П... школ у сераду 13-XI г. г. у 3 гадз...

4. Конфэрэнцыя выкладчыкаў пр... знаўства ў сераду 13-XI г. г. у 6... увечары.

5. Конфэрэнцыя выкладчыкаў гр... знаўства ў сераду 13-XI г. г. у 7... увечары.

Аб часе іншых конфэрэнцый гля... зэту „Зьвязда", „Рабочай" і „Акцяб... 10-XI г. г.

Яўка настаўнікаў на конфэрэнцы... вязкова.

Адказны рэдактар
П. ШАСТАК...

Масцком і супрацоўнікі Наркамасьветы з вялікім жалем паведамляюць, што ўначы 10 лістапада г. г. памёр на 11 дзень пасьля апэрацыі НАВУ... КОВЫ С